

# ШАС: ПЛЁН АД СУПРАЦОЎНІЦТВА

**Завяршыўся шматдзённы візіт Прэзідэнта ў Кітай**

(Стар. 2–3)

РОДНАЯ ГАЗЕТА НА РОДНАЙ МОВЕ

ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

4 ВЕРАСНЯ 2025 г. ЧАЦВЕР № 170 (30558)




ТРЕТИЙ БЕЛОРУССКО-УЗБЕКСКИЙ ЖЕНСКИЙ БИЗНЕС-ФОРУМ

Вынікам работы III Беларуска-ўзбекскага жаночага бізнес-форуму стала падпісанне камерцыйных дакументаў на агульную суму звыш 260 мільёнаў беларускіх рублёў і 18 дакументаў аб двухбаковым супрацоўніцтве.

Прывітальныя адрасы ўдзельнікам форуму накіравалі Прэзідэнты Беларусі і Узбекістана. «Сімвалічна, што сустрэча праходзіць у год 80-годдзя Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне, — гаворыцца ў пасланні Аляксандра Лукашэнкі. — У тыя грозныя часы беларусы і ўзбекі пляччо ў пляччо мужна ваявалі на франтах супраць агульнага ворага. І сёння паміж нашымі народамі няма раздзяляльных ліній, а трывалыя сяброўскія сувязі правераны часам. Сведчанне таму — дынамічнае развіццё Беларусі і Узбекістана ва ўсіх без выключэння сферах: ад эканомікі да гуманітарнага супрацоўніцтва».

# АДПРАЎНЫ ПУНКТ НОВЫХ ПРАЕКТАЎ

СТАР. 4

Фота БелТА.

ЧЫМ ПРЫЦЯГВАЕ СВЯТА ПІСЬМЕНСТВА

5

ДЗЕНЬ БЕЛАРУСКАГА ПІСЬМЕНСТВА

**Яшчэ больш цікавых навін па-беларуску — у нашым тэлеграм-канале @zviazdaby. Падпісвайцеся, чытайце, будзьце ў курсе!**

ISSN 1990 — 763X

25170>

КАРЫСНЫ ДОСВЕД

## БАБУЛЯ АНЛАЙН

**Курсы лічбавай адукаванасці папулярныя ў пенсіянераў**



У адной з аўдыторый Тэрытарыяльнага цэнтра сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва Савецкага раёна раз на тыдзень збіраецца больш за дзесяць пажылых людзей. Камусьці ўжо за шэсцьдзясят, некаторым — даўно за восемдзесят. Нягледзячы на ўзрост, яны прыходзяць сюды вучыцца. Мэта ўдзельнікаў гуртка «Смарцік» простая і нялёгкая адначасова — стаць упэўненымі карыстальнікамі смартфонаў.

СТАР. 15

# ШАС: ПЛЁН АД

## Завяршыўся шматдзённы

Візіт Прэзідэнта Беларусі Аляксандра ЛУКАШЭНКІ ў Кітай скончыўся ўрачыста. У сераду беларускі лідар паўдзельнічаў у мерапрыемствах, прысвечаных 80-годдзю Перамогі над японскім мілітарызмам і заканчэнню Другой сусветнай вайны. Кіраўнік дзяржавы прысутнічаў на ваенным парадзе ў Пекіне.




Высокіх гасцей сустракаў Старшыня КНР Сі Цзіньпін са сваёй жонкай Пэн Ліюань. Затым адбылася цырымонія сумеснага фатаграфавання, пасля чаго лідары краін разам накіраваліся на трыбуну на плошчы Цяньаньмэнь.

Маштабны ваенны парад у азнаменаванне 80-годдзя Перамогі над японскім мілітарызмам і заканчэння Другой сусветнай вайны стаў кульмінацыяй серыі важных мерапрыемстваў, уключаючы саміт Шанхайскай арганізацыі супрацоўніцтва (ШАС). Цырымонія доўжылася амаль 70 хвілін.

На парадзе прысутнічалі таксама кіраўнікі дзяржаў і ўрадаў двух з паловай дзясяткаў краін. Адкрываючы ўрачысты парад, Старшыня КНР Сі Цзіньпін выказаў пашану ўдзельнікам Другой сусветнай вайны і падзякаваў замежным урадам і замежным дзеячам, якія ў свой час аказалі падтрымку і дапамогу ў адбіцці знешняй агрэсіі.

Пасля завяршэння парада Аляксандр Лукашэнка наведаў урачысты прыём у гонар кіраўнікоў дэлегацый ад імя Старшыні Кітайскай Народнай Рэспублікі Сі Цзіньпіна і яго жонкі Пэн Ліюань.

# «ГЭТА СВЯДОМЫ, ЦЫВІЛІЗАЦЫЙНЫ ВЫБАР НА

## Эксперты — пра ролю і месца нашай краіны ў вялікай сям'і ШАС

У панядзелак, 1 верасня, на пасяджэнні Савета кіраўнікоў дзяржаў Шанхайскай арганізацыі супрацоўніцтва, якое праходзіла ў Цяньцзіне, Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка агучыў галоўныя акцэнты, на якіх неабходна засяродзіцца яе ўдзельнікам для дасягнення пастаўленых мэт. Нашы эксперты — пра ролю і месца Беларусі ў «Шанхайскай сям'і» і перспектывы гэтай арганізацыі.

### УСТУПЛЕННЕ Ў ШАС — НЕ ДАНІНА МОДНАМУ ТРЭНДУ



**Аналітык БІСІ Юрый ЯРМАЛІНСКІ** звяртае ўвагу, што мінулы год у статусе паўнапраўнага члена Шанхайскай арганізацыі супрацоўніцтва пацвердзіў правату раней абранага Рэспублікай Беларусь стратэгічнага курсу на ўступленне ў гэту арганізацыю:

— Мы сталі мацнейшымі самі і ўмацавалі яе базіс.

Ён падкрэслівае, што ўступленне ў ШАС для нас не проста даніна моднаму трэнду:

— Гэта свядомы, цывілізацыйны выбар у духу часу на карысць прагрэсіўнай сусветнай большасці. У яго касцяку — амбіцыйныя дзяржавы глабальнага Поўдня і Усходу, якія вызначаюць і будуць вызначаць будучы светапарадак. Сярод іх — даўнія сябры і партнёры Беларусі: перш за ўсё Расія, Кітай, Індыя.

Аналітык канстатуе: амаль за 25 гадоў існавання ШАС ператварылася з простага шматбаковага механізму сустрэч кіраўнікоў дзяржаў, накшталт прэзідэнцкага клуба, у найбуйнейшую ў свеце з пункту гледжання агульнай тэрыторыі, дэмаграфіі і рэсурснага патэнцыялу рэгіянальную міжнародную арганізацыю — унікальную «шанхайскую сям'ю», якая дэманструе магутную жыццёвую сілу і энергію:

— Менавіта з ёй (а таксама БРІКС) мы звязваем сваю будучыню. Мы не толькі карыстаемся яе магчымасцямі, але і бяром на сябе канкрэтныя абавязацельствы, за якія нясём адказнасць. Беларускія сектаральныя ініцыятывы падтрымліваюцца і імплементуюцца. Уся гісторыя ўзаемадзеяння з ШАС (ад статусу партнёра па дыялогу да поўнафарматнага членства) не раз пацвярджала фундаментальныя прынцыпы і філасофію беларускай знешняй палітыкі — надзейнасць, абавязковасць і паслядоўнасць.

Аналітык тлумачыць, што першапачаткова падзяляючы і актыўна прапаведуючы ў сябе ў рэгіёне прынцыпы «шанхайскага духу» як ідэйнай асновы будучай сусветнай архітэктуры, наша краіна арганічна і натуральна дапаўняе прастору ШАС сваім разнапрофільным патэнцыялам, знаходзячыся на стратэгічным франціры паміж Еўропай і Азіяй.

— Разам з тым, уваходзячы ў «сям'ю» ШАС, Мінск не закрывае дзверы і для краін Захаду. Пакуль яны будуюць на мяжы забory і агрэсіўна мілітарызуюцца, мы ўзводзім «масты» (напрыклад, прапануем бязвізавы ўезд) для простых людзей і чакаем, пакуль іх «блудныя» палітыкі прачнуцца і вернуцца да актыўнай дыпламатыі, — прыводзіць прыклад Юрый Ярмалінскі.

На яго думку, тэзіс «інтэграцыя інтэграцый ад Лісабона да Уладзівастока» не страціў сваёй актуальнасці, змяніліся акцэнты:

— Мы толькі патрабуем узаемапаважлівага раўнапраўнага дыялогу, без ментарства, папярэдніх умоў і спроб насаджэння чужых нам каштоўнасцяў.

### УЗАЕМАВЫГАДНАЕ ПАРТНЁРСТВА Ў СФЕРЫ НАВУКІ



У эфіры ток-шоу «Будні» на «Альфа Радыё» **член Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па міжнародных справах Аляксандр ШПАКОЎСКІ** адзначыў тое, што робіць Беларусь на пляцоўцы ШАС сёлета, мае гістарычны характар:

— Таму што гэта робіцца ўпершыню: упершыню наша краіна ў Шанхайскай арганізацыі супрацоўнічае як паўнавартасны ўдзельнік дадзенай структуры. Натуральна, усеагульная ўвага прыкавана да дзеянняў Беларусі на найвышэйшым узроўні: да выступленняў кіраўніка дзяржавы, да прапаноў, якія агучваюцца афіцыйным Мінскам. Відаць, што наша краіна тут не з'яўляецца статыстам.

На думку дэпутата, у выказаных прапановах Беларусі прыкметны пэўны нацыянальны каларыт, бо ў гэтых кірунках наша краіна, з аднаго боку, мае пазітыўныя вынікі, з другога боку, сутыкаецца са спробамі стрымлівання ў развіцці гістарычнымі апанентамі. Дэпутат растлумачыў:

— Нас не спрабуюць заблакіраваць з пункту гледжання доступу да навінак навукова-тэхналагічнага прагрэсу? Спрабуюць. Не спрабуюць перашкаджаць нашаму экспарту шляхам стварэння розных перашкод на лагістычных маршрутах? Спрабуюць. Не спрабуюць заблакіраваць нашы плацежныя аперацыі і аказаць адпаведныя негатыўныя ўздзеянні на нашых гандлёва-эканамічных партнёраў? Спрабуюць. Хіба не сутыкаюцца дзяржавы ШАС з тымі ж выклікамі? Відавочна, што канкурэнцыя ў свеце з пункту гледжання дасягненняў высокага інтэлекту, навукова-даследчых, канструктарскіх распрацовак будзе абвастрацца. І, вядома, у мэтах захавання свайго дамінуючага становішча калектыўны Захад будзе ўсяляк спрабаваць абмяжоўваць у развіцці іншыя дзяржавы.

# СУПРАЦОЎНІЦТВА

## візіт Прэзідэнта ў Кітай

**По традыцыі кіраўніка беларускай дзяржавы свята працоўным пытанням не перашкодзіла. У сераду ў Пекіне Аляксандр Лукашэнка правёў некалькі двухбаковых сустрэч з замежнымі лідарамі.**

Прэзідэнт пагутарыў з прэм'ер-міністрам Славакіі Робертам Фіца. Як паведаміў Telegram-канал «Пул Першага», абмяркоўвалі сумесную работу. Роберт Фіца запрасіў вызначыць час для наведвання Беларусі для абмеркавання магчымых варыянтаў супрацоўніцтва.

Серыя двухбаковых сустрэч прадоўжылася размовай з Прэзідэнтам Інданезіі Прабова Субіянта, які нядаўна наведваў Беларусь. Лідары краін абмеркавалі пытанні двухбаковага супрацоўніцтва, у тым ліку сферу адукацыі — навучанне інданезійцаў у Беларусі. Прабова Субіянта запрасіў Аляксандра Лукашэнку здзейсніць візіт у Інданезію.

Адбыліся нефармальныя сустрэчы беларускага лідара з прэзідэнтамі Зімбабвэ і Конга Эмерсанам Мнангагвам і Дэні Сасу-Нгесо. Кіраўнікі дзяржаў абмеркавалі далейшыя сумесныя планы. У прыватнасці, паглыбленую мадэрнізацыю эканомікі Зімбабвэ ў прамысловасці і сельскай гаспадарцы. Абмеркавалі і новую праграму для Зімбабвэ, якую плануе стварыць Беларусь. Эмерсан Мнангагва падзякаваў Аляксандру Лукашэнку за захаванне харчовай бяспекі ў рэгіёне і запрасіў наведаць Зімбабвэ яшчэ раз.

А да пачатку парада ў Пекіне Кіраўнік беларускай дзяржавы сустрэўся з лідарам КНДР Кім Чэн Ынам, які запрасіў Прэзідэнта наведаць яго краіну ў любы зручны час.

**За пяць дзён візіту Прэзідэнта ў Кітай было абмеркавана мноства пытанняў, вызначаны кірункі супрацоўніцтва, дасягнуты дамоўленасці, выкананне якіх зробіць сяброўства Беларусі і Кітая яшчэ больш трывалым.**

**Паводле БелТА і прэс-службы Прэзідэнта.**







# КАРЫСЦЬ ПРАГРЭСІЎНАЙ СУСВЕТНАЙ БОЛЬШАСЦІ»

У сувязі з гэтым, па словах спікера, наша краіна, валодаючы развітой індустрыяй, пэўнымі дасягненнямі ў галіне навукі, адукацыі, запазычанымі яшчэ ў савецкі час і развітымі ў суверэннай Беларусі, разглядае КНР і партнёраў па ШАС як аснову для ўзаемавыгаднага супрацоўніцтва ў сферы даследаванняў, навукі і тэхналогій.

— Гэта асабліва датычыцца, вядома, партнёрства з Кітаем. Адпаведныя дакументы падпісаны, ёсць двухбаковы фармат, рашэнні аб далучэнні шасці беларускіх універсітэтаў да адпаведнай сеткавай структуры ШАС. Мы над усім гэтым сур'ёзна працуем. Таму выступленне Прэзідэнта, на мой погляд, было вельмі дакладна падрыхтавана. З аднаго боку, мы не выпусцілі ўласныя нацыянальныя інтарэсы і тыя пазіцыі, якія трэба было з пункту гледжання Мінска агучыць на міжнароднай пляцоўцы ШАС. З другога боку, гэтыя выказаныя пазіцыі адпавядалі агульным інтарэсам большасці краін-удзельніц, — дадаў Аляксандр Шпакоўскі.

## АДЗІНЫ ФАКТАР ДЛЯ РАЗВІЦЦЯ

— Дыпламатыя, эканоміка і палітыка цесна звязаныя. І сёння іх межы нярэдка ўмоўныя. Палітыку робяць людзі, і тое, якія яна набывае формы, залежыць ад узроўню дыпламатыі і становішча спраў у эканоміцы кожнага з двух бакоў, — звяртае ўвагу **псіхолаг Алёна ДЗІЁДЗІНА** ў эфіры СТВ. — З аднаго боку, якасць эканомікі паказальная ў тым плане, наколькі патэнцыяльны партнёр умее выконваць пагадненні і заставацца надзейным саюзнікам, ці здольны ён да перспектыўных рашэнняў, наколькі ўмее планаваць, прагназаваць і паступаць разумна. Эканоміка не існуе па-за адносінамі дзвюх асоб. Мы гэта можам убачыць на саміце ШАС, які адбываўся ў Цяньцзіні.



Псіхолаг канстатуе: за кожным з лідараў краін стаяў свой унікальны набор магчымасцяў, але якім чынам аб'яднаюцца намаганні, залежала ад удзельнікаў саміту:

— Аж да таго, ці змогуць гэтыя магчымасці з двух бакоў спалучацца ў адзінае цэлае. У перспектыве. Бо партнёрскія адносіны — гэта камунікацыя прадстаўнікоў краін. Паколькі без дыялогу немагчыма ні адно пагадненне, без зносін не вырашаюцца цяжкасці і не знаходзіцца канструктыўны выхад пры праблемных пытаннях. Без неабходнага ўзроўню дыпламатыі канструктыўнай камунікацыі не атрымаецца. А значыць, перспектыўнага вектара эканамічных сувязяў можа наогул не ўзнікнуць.

Яна задаецца пытаннем: «Якім чынам гэта адаб'ецца на палітыцы, калі камунікацыя лідараў краін, да прыкладу, не пакіне магчымасці працягваць перспектыўныя адносіны і супрацоўнічаць?»

— Абсалютна заканамерным чынам упушчаныя магчымасці, страта ранейшых эканамічных сувязяў і цяжкасці ў тым, каб выбудаваць новыя, адаб'ецца на ўзроўні жыцця, вызначаючы месца краіны ў палітычнай плоскасці і ўплываючы на сацыяльныя настроі ў грамадстве, — адказвае Алёна Дзіёдзіна. — Жыхар любой краіны хацеў бы добрай якасці жыцця. Але без эканомікі і дыпламатыі не атрымаецца ні захаваць аўтаномнасць у сваёй дзяржаве, ні падтрымаць сваіх грамадзян, у той час як гэта і ёсць адна з асноўных задач урада.

Перамяшчаючы фокус увагі да саміту ШАС у Цяньцзіне, яна падкрэслівае, што мерапрыемства ўяўляла сабой вялікую дыялогавую пляцоўку, дзе прадстаўнікі краін маглі не толькі што-небудзь прапанаваць іншым, але і прыглядзецца да патэнцыяльных партнёраў.

— Наведванне падобных мерапрыемстваў дазваляе адчуць, а ці надзейная гэта краіна ў адносінах і ці камфортны дыялог з яе лідарам. Перспектывы партнёрства вызначацца з адказам. Так, палітыка, эканоміка і здольнасць канкрэтнай асобы да дыпламатыі выступаюць адзіным фактарам для развіцця, — заключае эксперт.

## ТРЭК — НА ПАШЫРЭННЕ АДНОСІН

Найважнейшым вынікам саміту ШАС у Кітаі **член Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па заканадаўстве і дзяржаўным будаўніцтве Людміла САПЕГА** лічыць прыняцце так званай Цяньцзінскай дэкларацыі.



— Гэта цэнтральны выніковы дакумент, прыняты на вышэйшым узроўні, які з'яўляецца, па сутнасці, праграмай дзеяння краін-удзельніц ШАС на найбліжэйшыя гады. Практычная рэалізацыя яго асноўных палажэнняў, такіх як установа банка развіцця ШАС, адаптацыя дзейнасці ААН да сучасных палітычных рэалій, супрацоўніцтва ў ваеннай галіне, абарона гістарычнай праўды аб Другой сусветнай вайне, умацаванне супрацоўніцтва па пытаннях устойлівага развіцця, напэўна, паспрыяе ўсталяванню даверных і раўнапраўных адносін не толькі паміж краінамі — удзельніцамі ШАС, але і з усімі, хто падзяляе выкладзеныя ў дакуменце падыходы і прынцыпы.

Яшчэ адным важным вынікам саміту парламентарый называе шэраг двухбаковых сустрэч, якія Аляксандр Лукашэнка правёў з лідарамі вядучых дзяржаў свету.

— За тры няпоўныя дні знаходжання ў Кітаі наш Прэзідэнт сустрэўся з кіраўнікамі Кітая, Расіі, КНДР, Індыі, Турцыі, Азербайджана, Інданезіі, Зімбабвэ, Конга, Славакіі, — кажа сенатар. — І кожная з іх была напоўнена канкрэтным зместам. Напрыклад, з прэзідэнтам Зімбабвэ Аляксандр Лукашэнка абмеркаваў новую праграму для гэтай краіны, якую плануе стварыць Беларусь для паглыбленай мадэрнізацыі эканомікі Зімбабвэ ў прамысловасці і сельскай гаспадарцы. На сустрэчы нашага Прэзідэнта з калегам з Інданезіі былі ўзняты пытанні двухбаковага супрацоўніцтва, у тым ліку ў сферы адукацыі.

— Гэтыя і многія факты сведчаць: у свой час дзякуючы мудрасці Аляксандра Лукашэнкі Беларусь правільна расставіла прыярытэты ў сваёй знешнепалітычнай дзейнасці. Што дазволіла нашай краіне заняць годнае месца ў новай міжнароднай палітычнай і эканамічнай рэальнасці, — акцэнтуе ўвагу суразмоўца.

# АДПРАЎНЫ ПУНКТ НОВЫХ ПРАЕКТАЎ




## ЗМЯСТОЎНЫ ДЫЯЛОГ БІЗНЕС-СУПОЛЬНАСЦІ, ЖАНЧЫН І МОЛАДЗІ

Сёлетні форум, прысвечаны тэме «Беларусь — Узбекістан: супрацоўніцтва як фактар устойлівага развіцця», які 2—3 верасня праходзіў у Віцебску, прадэманстраваў трывалыя давер і цікавасць прадстаўнікоў дзвюх краін да рознабаковага супрацоўніцтва, а таксама станоўчую дынаміку ў паглыбленні дзелавых і братэрскіх сувязяў.

**Старшыня Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь Наталля КАЧАНАВА** нагадала, што два папярэднія аналагічныя мерапрыемствы, якія праходзілі ў Мінску і Ташкенце, таксама былі выніковымі. Тады было заключана 30 кантрактаў на суму 235 мільёнаў беларускіх рублёў і падпісана 36 пагадненняў. Напярэдадні пленарнага пасяджэння плённа працавалі сем тэматычных секцый. Іх удзельнікі разгледзелі перспектыўныя кірункі сумеснай работы ў галінах машынабудавання, лёгкай прамысловасці, аграпрамысловага комплексу, турызму, навукі, адукацыі і аховы здароўя. Упершыню прайшла сустрэча кіраўнікоў органаў мясцовага самакіравання абодвух бакоў. Створана Міжпарламенцкая камісія па супрацоўніцтве Савета Рэспублікі і Сената Олій Мажліса. Адбылося яе першае пасяджэнне.

«Камісія стане эфектыўнай пляцоўкай для абмеркавання шырокага спектра пытанняў, якія прадстаўляюць узаемны інтарэс, і выканання ключавой задачы, якую паставілі кіраўнікі дзяржаў перад верхнімі палатамі парламентаў, — пастаянны сістэмны маніторынг за ходам рэалізацыі планаў мерапрыемстваў па развіцці супрацоўніцтва паміж Беларуссю і Узбекістанам», — упэўнена Старшыня Савета Рэспублікі.

Працягваецца змястоўны дыялог паміж жаночымі арганізацыямі дзвюх краін. У гэтым годзе праграму форуму дапоўніў круглы стол з удзелам іх прадстаўніц. Падпісана пагадненне паміж Віцебскай абласной арганізацыяй Беларускага саюза жанчын і хакіміятам горада Ташкента. Моладзь абмяркоўвала пытанні, якія яе цікавяць, на дыялогавай пляцоўцы. Кіраўнікі маладзёжных структур таксама падпісалі Мемарандум аб супрацоўніцтве. Прадстаўнікі бізнесу шукалі патэнцыяльныя кропкі росту ўзаемнага тавараабароту і інвестыцый на пасяджэнні дзелавога савета.

Наталля Качанава звярнула ўвагу на шырокае прадстаўніцтва на форуме бізнес-лэдзі і адзначыла, што сваім прыкладам, узорнымі адносінамі да справы яны з'яўляюцца якасным арыенцірам для калег і партнёраў. «З іх дасягненняў і поспехаў складаецца агульная карціна дабрабыту нашых грамадзян і перспектывы ўстойлівага развіцця», — падкрэсліла Старшыня Савета Рэспублікі.

Спікер засяродзіла ўвагу на неабходнасці стварэння належных прававых умоў для развіцця бізнесу ва ўсіх галінах і сферах. «Без валакіты і бюракратыі праводзіць работу па выкараненні бар'ераў ва ўзаемным гандлі з мэтай давядзення тавараабароту ў найбліжэйшай перспектыве да 1 мільярда долараў, — канкрэтызавала яна. — Менавіта такая задача сфармулявана ў «дарожнай карце», зацверджанай прэзідэнтамі нашых краін».

## ВЫТВОРЧЫ ПАТЭНЦЫЯЛ І ПАШЫРЭННЕ ЎЗАЕМНЫХ ТУРЫСТЫЧНЫХ ПАТОКАЎ

Наталля Качанава лічыць прынцыпова важным, каб ініцыятывы, якія агучылі кіраўнікі краін, дасягнутыя дамоўленасці і ўмовы супрацоўніцтва рэалізоўваліся на практыцы. Гэта датычыцца стварэння сумесных вытворчасцяў у галіне дрэваапрацоўкі, кааперацыйных праектаў у машынабудаванні, кабельна-праваднiковай прамысловасці, фармацэўтыкі.

«Вытворчы патэнцыял дзвюх дзяржаў проста вялізны, — канстатавала спікер. — Напрыклад, беларускія аграрыі здольныя накарміць сёння тры Беларусі. І яны гатовыя пастаўляць сваю прадукцыю ва Узбекістан, дзяліцца назапашаным вопытам».

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

### Асобныя факты

- Беларусь і Узбекістан рэалізуюць каля 80 адукацыйных праектаў.
- У Беларусі вучацца каля 4 тысяч студэнтаў з Узбекістана.
- Па ўсім Узбекістане ствараецца сетка сэрвісных цэнтраў па рамонце трактароў BELARUS. Адначасова ідзе работа па адкрыцці вучэбных класаў МТЗ для падрыхтоўкі спецыялістаў.
- Арганізацыі холдынга «Белфарм» вядуць работу па лакалізацыі вытворчасці лекавых сродкаў ва Узбекістане.

Плануецца стварыць сумесную спецыялізаваную знешнегандлёвую кампанію з офісамі ў Мінску і Ташкенце, а таксама гандлёвыя дамы з арганізацыяй у іх шоўрумаў, якія будуць дзейнічаць на пастаяннай аснове.

Старшыня Савета Рэспублікі выказалася наконт таго, што форум з'яўляецца пляцоўкай для зблiжэння не толькі суб'ектаў гаспадарання, але і для ўстанаўлення і развіцця пабрацімскіх сувязяў па прыкладзе Мінска і Ташкента. «Савет Рэспублікі, як палата тэрытарыяльнага прадстаўніцтва, зацікаўлены ў дыялогу паміж гарадамі і раёнамі, каб павысіць інвестыцыйную і турыстычную прывабнасць малых гарадоў», — адзначыла Наталля Качанава.

Па словах спікера, Беларусь зацікаўлена ў супрацоўніцтве і пашырэнні ўзаемных турыстычных патокаў. Сёлета ва Узбекістане адбудзецца II Беларуска-ўзбекскі турыстычны форум, і яго трэба скарыстаць як пляцоўку для запрашэння гасцей наведаць нашу краіну.

«Міралюбівая і добрасуседская знешняя палітыка Беларусі выражаецца і ў тым, што грамадзяне 101 дзяржавы могуць да аднаго месяца знаходзіцца на нашай тэрыторыі без візы, — канстатавала Наталля Качанава. — З пачатку года такой магчымасцю скарысталіся больш за 160 тысяч іншаземцаў».

Перспектыўнымі бачацца на толькі гандлёвыя зносіны, але і больш рашучы пераход да ўзаемнага інвесціравання і прамысловай каапераці. Цікавыя тэмы — абмен працоўнымі рэсурсамі, сумесныя навуковыя работы, распрацоўка інавацыйнай прадукцыі і тэхналогій. Нельга недаацэньваць супрацоўніцтва ў гуманітарнай сферы.

Наталля Качанава лічыць, што нашым краінам удалося вывесці свае адносіны на новы ўзровень. «Як адзначыў Аляксандр Лукашэнка падчас афіцыйнага візіту ў Ташкент у лютым 2024 года, Узбекістан стаў для Беларусі апорным пунктам у Цэнтральнай Азіі, — нагадала спікер. — Рэгулярны фармат нашых сустрэч з'яўляецца пацвярджэннем гэтых слоў, паказвае ўзаемны інтарэс да пашырэння і ўмацавання дзелавых сувязяў, трансферу найлепшых бізнес-практык».

Старшыня Сената Олій Мажліса Рэспублікі Узбекістан Танзіла Нарбаева запрасіла беларускіх сяброў на IV Беларуска-ўзбекскі жаночы бізнес-форум, паабяцаўшы, што ў наступным годзе ён адбудзецца ў адным з найпрыгажэйшых і найстарэйшых гарадоў Узбекістана. А ў першай палове 2026 года афіцыйны візіт у Беларусь здзейсніць Прэзідэнт Узбекістана Шаўкат Мірзіёеў. Сяброўства працягваецца.

**Святлана ЯКАЎЛЕВА.**
**Фота БелТА.**



### У тэму

## У Беларусі і Узбекістана ёсць канструктыўнае ўзаемадзеянне на ўсіх узроўнях



Віцэ-прэм'ер узяў удзел у пленарным пасяджэнні III Беларуска-ўзбекскага жаночага бізнес-форуму на тэму «Беларусь — Узбекістан: супрацоўніцтва як фактар устойлівага развіцця», паведамілі ў прэс-службе ўрада.

Ён адзначыў, што сёлета, па выніках першага паўгоддзя, захоўваецца станоўчая дынаміка ўзаемнага тавараабароту з ростам на 18 %.

— Мы бачым, што ва Узбекістане вельмі пазітыўна ўспрымаюць беларускі бізнес. Аналагічна і ў нас цёпла ставяцца да ўзбекскіх прадпрымальнікаў, — адзначыў віцэ-прэм'ер. — За мінулыя гады мы дамагліся нядрэнных вынікаў ва ўзаемным гандлі. Гэты паказчык павялічыўся за апошнія гады на 12 %.

Дастаткова актыўна ідзе рэалізацыя «дарожнай карты» супрацоўніцтва на 2024—2025 гады. Далейшае развіццё эканамічных адносін і іх практычнае напаўненне Беларусь бачыць у пераходзе да ўзаемнага інвесціравання ў прамкааперацыю.

— Балазе патэнцыял для нарошчвання інвестыцыйнай дзейнасці ў нас дастаткова вялікі. У 2024 годзе аб'ём беларускіх інвестыцый у эканоміку Узбекістана павялічыўся больш чым на чвэрць да ўзроўню 2023 года. Станоўчая дынаміка захоўваецца і сёлета, — запэўніў Юрый Шулейка. — Павялічваецца колькасць кампаній з капіталам з Узбекістана — іх ужо 78, гэта значыць, за год прырасло на дзевяць арганізацый. Для пашырэння супрацоўніцтва неабходна больш актыўна знаходзіць спалучэнне па сумесных праектах — там, дзе мы адзін аднаго дапаўняем па кампетэнцыях, сыравінных складніках, рынках збыту.

Паводле слоў віцэ-прэм'ера, для стварэння прывабнага інвестыцыйнага асяроддзя беларускім бокам прымаюцца ўсе неабходныя практычныя меры:

— Так, уведзена стабілізацыйная агаворка, пашыраны пакет ільгот і прэферэнцый, напрыклад вызваленне ад падатку на прыбытак на пяць гадоў, пакрыццё выдаткаў на інфраструктуру. Укаранёны таксама бюджэтныя трансферты, пакрыццё часткі капітальных выдаткаў па праекце да 35 %. Пры вытворчасці пэўнай імпартазамяшчальнай прадукцыі прадугледжана магчымасць заключэння спецыяльнага інвестыцыйнага дагавора. Спрошчаны фармат рэалізацыі праекта з пакетам стандартных ільгот.

У адносінах з Узбекістанам Беларусь нацэлена на доўгатэрміновае ўзаемадзеянне, стварэнне вытворчасцяў прадукцыі з высокай дабаўленай вартасцю, падкрэсліў Юрый Шулейка.

— З улікам наяўных рэсурсаў бачым сур'ёзны патэнцыял у машынабудаванні, лёгкай прамысловасці, — адзначыў віцэ-прэм'ер. — Пастаўляючы сваю тэхніку і абсталяванне, мы, натуральна, не забываем аб іх якасным абслугоўванні. На бягучы момант па ўсім Узбекістане ідзе стварэнне сеткі сэрвісных цэнтраў па рамонце трактароў BELARUS. Пры гэтым вядзецца работа па адкрыцці навучальных класаў МТЗ для падрыхтоўкі спецыялістаў.

НАПЯРЭДАДНІ

# «ЖЫВАЯ КЛАСІКА» І ЖЫВЫЯ СЛОВЫ

## Свята пісьменства як вялікі агляд літаратурнага патэнцыялу краіны

Дзень беларускага пісьменства

Духоўна-асветніцкая экспедыцыя «Дарога да святыняў», што традыцыйна адбываецца напярэдадні Дня беларускага пісьменства, чарговы раз стартавала ад Свята-Духава кафедральнага сабора ў Мінску. Гэта адзін з тых вялікіх і значных праектаў нацыянальнага маштабу, якія дзяржава ажыццяўляе пры падтрымцы Беларускай праваслаўнай царквы. А сёлета гэтае супрацоўніцтва было замацавана пагадненнем аб супрацоўніцтве паміж Міністэрствам інфармацыі і Беларускай праваслаўнай царквой, якое падпісалі Марат Маркаў і Мітрапаліт Мінскі і Заслаўскі Веніямін, Патрыяршы Экзарх усяе Беларусі.

### З АГНЁМ У ДУШЫ

Менавіта з Мінска выправіліся ў доўгі шлях (прайсці давядзецца 777 кіламетраў) удзельнікі экспедыцыі «Дарога да святыняў», якія праз розныя населеныя пункты нясуць Жыватворны агонь у Ліду. У звароце да іх уладыка адзначыў важнасць сустрэч з мясцовымі жыхарамі: ідуць размовы пра духоўнасць і мараль, любоў да Айчыны, гісторыі і культуры, павагу да роднай мовы. А пасля такіх сустрэч у мясцінах, аб'яднаных маршрутам экспедыцыі, высаджваюць дрэвы — і там вырастае Маліто́ўны сад...

Адметнасць гэтай духоўнай місіі адзначыў і **міністр інфармацыі Беларусі Марат МАРКАЎ.** Дзеля таго каб праца па ўмацаванні маральных каштоўнасцяў і папулярызацыі духоўнай спадчыны краіны ішла яшчэ больш плённа, у сценах Мінскай духоўнай акадэміі было заключана пагадненне аб супрацоўніцтве паміж Міністэрствам інфармацыі і Беларускай праваслаўнай царквой, замацаванае подпісамі Марата Маркава і Мітрапаліта Мінскага і Заслаўскага Веніяміна, Патрыяршага Экзарха ўсяе Беларусі. Падпісаны дакумент абнаўляе ўмовы таго, які дзейнічаў раней, паколькі за гады адбыліся змены і фармат зносін. У ім пазначаны задачы цяперашняга часу па выхаванні нового пакалення ў духу патрыятызму, падтрыманні міжканфесійнага дыялогу і стварэнні пляцовак для абмену вопытам паміж СМІ ў духоўна-асветніцкай і культурнай сферах. Што гэта значыць на практыцы? Дзяржава бачыць у царкве партнёра і спадзяецца на падтрымку ў барацьбе за розумы людзей і ўплыве на іх жыццёвы выбар — з улікам вялікага досведу, які быў набыты за часы існавання хрысціянства на нашых землях, якое стагоддзямі даводзіла неабходнасць змагацца за душы людзей. Вядома, рабіць гэта можна па-рознаму. Але звыш 500 гадоў адным з найбольш дзейсных сродкаў была кніга.

Якая гэта можа быць кніга? Свой варыянт прапанаваў Францыск Скарына з Полацка, які выдаваў кнігі духоўнага зместу, што спрыялі ўдасканаленню чалавечай асобы менавіта праз слова Божае. Адна са знакавых для беларускай культуры дат — 500 гадоў з дня першага на беларускіх землях выдання Скарынам кнігі «Апостала». Яна змяшчала 22 прадмовы і 17 пасляслоўяў самога першадрукара, дзе былі дадзены тлумачэнні тэксту і ўздымаліся пытанні маралі.

Гэтая тэма пройдзе чырвонай ніткай па большасці пляцовак у Лідзе, але варта звярнуць увагу на выстаўку, падрыхтаваную Нацыянальнай бібліятэкай Беларусі «Код Скарыны: кніга «Апостал» 1525 года і беларуская ідэнтычнасць». У Беларусі няма ніводнага асобніка той старажытнай кнігі, але можна зразумець, чым ён асаблівы, дзякуючы ілюстрацыйнаму матэрыялу, структуры, пабудове тэкстаў, іх мове і аздабленню. У экспазіцыі прадставяць і першае факсіміле «Апостала», выдадзенае Нацыянальнай бібліятэкай Беларусі ў рамках праекта «Кніжная спадчына Францыска Скарыны», які рэалізоўваўся з 2013 да 2017 года. Можна будзе пабачыць рэдкія выданні з першымі згадваннямі і навуковымі апісаннямі «Апостала». Перанесціся ў тыя далёкія часы таксама з'явіцца магчымасць — дзякуючы інтэрактыўнай друкарскай майстэрні «Падарожжа літары «А»: ад Скарыны да тваёй гравюры». Вось так, паводле прыкладу першадрукара, і задумаешся пра тое, што значыць быць патрыётам сваёй Радзімы: умацоўваць яе інтэлектуальны і духоўны патэнцыял.



Аднак адказ на гэтае пытанне насамрэч больш шырокі, згодна з беларускай гісторыяй: каб на радзіме жыло слова, яе даводзілася абараняць. Пра гэта нагадваюць шмат — і праз спецыяльныя праекты Нацыянальнай бібліятэкі, і праз адметныя выданні, прысвечаныя 80-годдзю Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне: значная дата таксама адлюстравана ў канцэпцыі свята. Розныя выдавецтвы Беларусі сёлета маюць, што прапанаваць па гэтай тэме. У Лідзе будуць прадстаўлены навінкі, анансаваныя напярэдадні свята. Напрыклад, у выдавецтве «Беларусь» пры падтрымцы Міністэрства інфармацыі выйшла кніга «Нашчадкі Перамогі», дзе ўкладальнікі сабралі сведчанні людзей, дзяцей вайны. Яшчэ адна адметная кніга — «Мінск памятае» Алены Харашэвіч, лаўрэата прэміі «За духоўнае адраджэнне». У выданні пазначаны ўсе помнікі, мемарыяльныя дошкі сталіцы. Такім чынам, з яе дапамогай можна на падарожнічаць па канкрэтных адрасах, якія дапамагаюць зразумець, што перажылі жыхары горада.

### СЛОВАМ І СПРАВАМІ

І тут варта звярнуцца менавіта да гістарычнай Ліды. Шэраг выданняў, прысвечаных гораду і раёну, — гэта таксама пра турыстычны патэнцыял краіны. Як і само свята. Столькі гасцей адразу трэба ўмець зацікавіць. Ліда збіраецца ўразіць дагледжанасцю і ўбраннем — увасабленне Года добраўпарадкавання. І на адметных мясцовых турыстычных маршрутах, шляхі якіх, напэўна, вядуць да замка. Але свята пісьменства — гэта не проста дзень у календары. Гэта шэраг імпрэз, якія ўжо адбыліся ці адбываюцца ў рамках падрыхтоўкі, а 6 і 7 верасня мы ўбачым іх вынік, у тым ліку на цэнтральнай сцэнічнай пляцоўцы.

У межах свята 26 жніўня адбыліся фінал і запіс відэаверсіі Рэспубліканскага конкурсу чытальнікаў «Жывая класіка». Упершыню, згодна з ініцыятывай арганізацыйнага камітэта, яго гала-канцэрт пройдзе на цэнтральнай сцэне 6 верасня, падчас якога можна будзе ўбачыць пераможцаў розных гадоў. Гэтае мерапрыемства адбываецца ў партнёрстве з Міністэрствам адукацыі.

— Хочацца адзначыць прафесіяналізм настаўнікаў беларускай мовы і літаратуры, а таксама ўсёй каманды, якая працуе над «Жывой класікай», і тэлеканала «Беларусь-3», які рыхтуе відэаверсію, — расказаў **старшыня журы конкурсу, дырэктар выдавецтва «Мастацкая літаратура» Аляксандр БАДАК.** — Упершыню конкурс прайшоў у 2017 годзе і быў прымеркаваны да Дня роднай мовы. Штогод ён адбываецца сярод дзяцей школьнага ўзросту і ўключае пяць этапаў. Першы — непасрэдна ў школах, другі — раённы, трэці — абласны і мінскі гарадскі. Далей — паўфінал, а летам, бліжэй да Дня беларускага пісьменства, праходзіць фінал. Сёлета ў «Жывой класіцы» ўдзельнічалі больш чым 15 тысяч школьнікаў. Для журы конкурс не самы лёгкі, таму што дзяцей ацэньваць даволі цяжка, асабліва маленькіх. Яны вельмі чуллівыя, старанныя, моцна перажываюць. Мяне заўсёды ўражвае, як дзеці на памяць чытаюць вялікія ўрыўкі з паэм, з прозы і не збіваюцца. У фінале не бывае выпадковых дэкламатараў. Сёлета пераможцы конкурсаў розных гадоў маюць магчымасць выступіць у Лідзе. Таксама ўнікальны выпадак: адзін з пераможцаў мінулых гадоў выйдзе сярод акцёраў тэатралізаванай пастаноўкі ў рамках адкрыцця Дня беларускага пісьменства.

Звычайна адкрыццё і закрыццё свята адбываюцца ўрачыста: гэта тэатралізаваная праграма, у якой бяруць удзел не толькі знакамітыя і заслужаныя артысты, але і прадстаўнікі новага пакалення, маладыя асобы, якія імкнуцца прасоўваць беларускую культуру. Адметнасць: згадваюцца не толькі класікі беларускай літаратуры, але і аўтары, якія пішуць у наш час, былі лаўрэатамі Нацыянальнай літаратурнай прэміі ў мінулым і тыя, што стануць пераможцамі ў гэтым годзе.

**Старшыня Саюза пісьменнікаў Беларусі Аляксандр КАРЛЮКЕВІЧ** выказаў удзячнасць дзяржаве за такую падтрымку сучасных творцаў: уручэнне Нацыянальнай літаратурнай прэміі стала важным складнікам Дня беларускага пісьменства. Сёлета будуць названы імёны тых, хто стаў аўтарамі найбольш яркіх твораў паэзіі, прозы, драматургіі, вызначаць найлепшых у публіцыстыцы, літаратурнай крытыцы і літаратуразнаўстве, накіруюць увагу настаўнікаў і бацькоў да адметнай кнігі для дзяцей і юнацтва. І яшчэ адна важная задача прэміі — падтрымаць маладых аўтараў праз намінацыю «Найлепшы дэбют». І, можа быць, такім чынам нашы чытачы адкрыюць для сябе новыя імёны і зразумеюць: літаратура — не толькі ў кнігах па школьнай праграме. Насамрэч гэта працэс, які адлюстроўвае час і клопаты сучаснага пакалення.

**— Праграма свята ўражальная, актыўны ўдзел у ёй бярэ грамадскае аб'яднанне «Саюз пісьменнікаў Беларусі», — адзначыў Аляксандр Карлюкевіч. — У вялікую дэлегацыю літаратараў са 116 чалавек увайшлі прадстаўнікі розных рэгіёнаў краіны. З нашага вялікага атрада (амаль 700 членаў Саюза пісьменнікаў Беларусі) даволі шмат паэтаў і празаікаў, якія прыедуць самастойна і будуць удзельнічаць у мерапрыемствах на розных пляцоўках — ад навуковых «Лідскіх чытанняў» да прэзентацый каля асобных стэндаў, сустрэч з чытачамі. Хацелася б звярнуць увагу на вялікую праграму, падрыхтаваную літаратарамі Гродзеншчыны на чале з Людмілай Кебіч, старшынёй Гродзенскага абласнога аддзялення Саюза пісьменнікаў Беларусі.**

Для нас гэта важна, бо нават тыя, хто не прыедзе на свята, не толькі члены Саюза пісьменнікаў, але і ўвогуле творчыя людзі нашай краіны, уключаны ў розныя паэтычныя і мастацкія імпрэзы. На розных лакацыях, якія прадстаўляюць рэгіёны, паэты і празаікі выступяць і прадставяць свае новыя кнігі, у тым ліку выдадзеныя апошнім часам.

Пабачыць і паслухаць сапраўднага пісьменніка, пазнаёміцца, набыць кнігу, магчымасць узяць аўтограф аўтара — тое, што прыцягвае патэнцыяльных чытачоў, для якіх свята пісьменства не скончыцца. Паколькі пасля будзе магчымасць асэнсаваць вартасць і вагу слоў — з часоў Скарыны і цяпер.

**Ларыса ЦІМОШЫК.**

**Фота БелТА.**



ИЗВЕЩЕНИЕ
О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона/ оператор** | ООО «ИПМ-Консалт оценка», 220004, г. Минск, ул. Немига, д. 40, пом. 46, оф. 1. www.ipmtorgi.by |
| **Продавец** | ООО «Гараторг групп», УНП 691734271, 222161, г. Жодино, пр-т Мира, д. 19а, пом. 28 |

| № п/п | Наименование предмета электронных торгов | Общая площадь, кв. м | Начальная цена (с НДС 20 %), долл. США* |
|---|---|---|---|
| 1 | Торговое помещение, инв. номер 612/D-18829 | 17,8 | **7 401,24** |
| 2 | Торговое помещение, инв. номер 612/D-18830 | 5,3 | **20 487,60** |
| | Торговое помещение, инв. номер 612/D-18831 | 48,9 | |
| 3 | Торговое помещение, инв. номер 612/D-18836 | 15,2 | **6 320,16** |
| 4 | Торговое помещение, инв. номер 612/D-18837 | 15,2 | **6 320,16** |
| 5 | Торговое помещение, инв. номер 612/D-18841 | 49,6 | **17 677,44** |
| 6 | Торговое помещение, инв. номер 612/D-18842 | 25,9 | **9 230,76** |
| 7 | Торговое помещение, инв. номер 612/D-18845 | 19,1 | **6 807,24** |
| 8 | Торговое помещение, инв. номер 612/D-18847 | 18,2 | **38 911,75** |
| | Торговое помещение, инв. номер 612/D-18848 | 14,8 | |
| | Торговое помещение, инв. номер 612/D-18849 | 14,9 | |
| | Торговое помещение, инв. номер 612/D-18850 | 17,0 | |
| | Торговое помещение, инв. номер 612/D-18851 | 14,7 | |
| 9 | Торговое помещение, инв. номер 612/D-18853 | 12,7 | **4 526,28** |
| 10 | Торговое помещение, инв. номер 612/D-18854 | 22,6 | **13 863,96** |
| | Торговое помещение, инв. номер 612/D-18855 | 16,3 | |
| 11 | Торговое помещение, инв. номер 612/D-18856 | 21,4 | **7 626,96** |
| 12 | Административное помещение, инв. номер 612/D-28362 | 107,2 | **19 899,00** |

**Местоположение: Минская область, г. Жодино, пр-т Мира, д. 19а**

*Оплата предмета электронных торгов производится в белорусских рублях в сумме, эквивалентной цене продажи лота в долл. США по курсу НБРБ на дату проведения платежа

**Задаток 10 %** от начальной цены предмета электронных торгов перечисляется в белорусских рублях по курсу НБРБ на дату внесения платежа на счет BY92BELB30120048350080226000 в ОАО «Банк БелВЭБ», г. Минск, ул. Мясникова, 32; БИК BELBBY2X; ОКПО 378531865000, получатель платежа – ООО «ИПМ-Консалт оценка», УНП 191224638

**Срок подписания договора купли-продажи: 10 (десять) рабочих дней** со дня завершения электронных торгов

**Условия оплаты предмета электронных торгов:** в течение 30 (тридцати) календарных дней после заключения договора купли-продажи (если не достигнута иная договоренность по срокам и о порядке оплаты предмета аукциона)

Порядок проведения электронных торгов, критерии выявления победителя торгов, порядок оформления участия в торгах и результатов торгов установлены регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги», размещенным по адресу: **www.ipmtorgi.by**

Победитель электронных торгов либо единственный участник электронных торгов, согласившийся повысить начальную цену предмета электронных торгов на 5 %, обязан возместить организатору торгов затраты на их проведение и оплатить вознаграждение от **4 %** до **6 %** от цены продажи в течение 3 рабочих дней после проведения электронных торгов

Организатор электронных торгов имеет право снять предмет аукциона с электронных торгов в любое время до момента определения победителя электронных торгов без объяснения причин снятия

Предыдущее извещение о проведении электронных торгов опубликовано в газете «Звязда» от 02.08.2025 г.

**Дата и время начала и окончания электронных торгов**: **15.09.2025 г. с 11.00 до 13.00.**
Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки, в случае если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов

**Дата и время окончания приема заявок:** заявки на участие в электронных торгах принимаются по **12.09.2025 г.** до 17.00 на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу: www.ipmtorgi.by

| | |
|---|---|
| **Контактные данные** | **Тел.: +375 (17) 373 21 33; +375 (44) 704-92-06. E-mail: info@ipmtorgi.by** |

ИНФОРМАЦИЯ О ПРОВЕДЕНИИ
ПОВТОРНОГО ЭЛЕКТРОННОГО АУКЦИОНА

**Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации»**
(организатор торгов и оператор электронной торговой площадки: torgi.rlt.by, местонахождение: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 321),
по поручению
**коммунального унитарного предприятия «ВилейкаТопливо»**
(продавец, местонахождение:
222417, Минская область, г. Вилейка, ул. Стахановская, 199)
проводит открытый аукцион

ПО ПРОДАЖЕ **ТРАНСПОРТНЫХ СРЕДСТВ,**

расположенных по адресу:
**Минская область, г. Вилейка, ул. Стахановская, 199.**

Лот № 1. **Автомобиль седельный тягач УРАЛ-43203-1011, 1987 г. в., регистрационный знак АВ 4366-5, рама № 070110; цвет темно-зеленый; установлен гидроманипулятор М-75, 2006 г. в., инв. № по бух. учету 90а.**
**Начальная цена с НДС (20 %) – 9 720,00 бел. руб.**
**Задаток 10 % от начальной цены – 972,00 бел. руб.**

Лот № 2. **Полуприцеп специальный сортиментовоз ALKA H-13, 1988 г. в., регистрационный знак 4784 АА-5, рама № 17754, цвет черный, инв. № по бух. учету 102.**
**Начальная цена с НДС (20 %) – 2 640,00 бел. руб.**
**Задаток 10 % от начальной цены – 264,00 бел. руб.**

Лот № 3. **Автомобиль грузовой специальный самосвал ЗИЛ-ММЗ-4502, 1991 г. в., регистрационный знак ОМ 1451, рама № М3176745, цвет темно-зеленый, инв. № по бух. учету 57.**
**Начальная цена с НДС (20 %) – 4 560,00 бел. руб.**
**Задаток 10 % от начальной цены – 456,00 бел. руб.**

Электронные торги проводятся в порядке, установленном постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 12.07.2013 г. № 608 и регламентом электронной торговой площадки «TORGI.RLT.BY», размещенным по адресу: torgi.rlt.by.
Информация о проводимых электронных торгах опубликована на сайтах: au.nca.by, minsk-region.gov.by, torgi.rlt.by.
*Предыдущая информация опубликована в газете «Звязда» от 03.06.2025.*
Электронные торги состоятся **22.09.2025** в **10.00.**
Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **18.09.2025** до **17.00.**

**Тел.: (8017) 516-80-65, 516-80-64, (8029) 102-21-17.**
**Тел. для осмотра (8029) 754 70 65.**

УНП 691193868

# НОВЫ ГІСТАРЫЧНЫ МАКСІМУМ

## Золатавалютныя рэзервы Беларусі павялічыліся да 12,4 мільярда долараў

ЗВР Беларусі на 1 верасня, паводле папярэдніх звестак, склалі 12,413 мільярда долараў у эквіваленце. Такія звесткі апублікаваны на сайце Нацыянальнага банка, паведамляе БелТА.



За жнівень 2025 года золатавалютныя рэзервы выраслі на 471,4 мільёна долараў (на 3,9 %) пасля росту ў ліпені больш чым на 400 мільёнаў долараў.

Найбольшую долю ў структуры міжнародных рэзервовых актываў Беларусі займаюць актывы ў замежнай валюце і манетарнае золата. Паводле звестак Нацбанка, аб'ём замежнай валюты ў рэзервах на 1 верасня склаў 5,0688 мільярда долараў, павялічыўшыся за жнівень на 251,8 мільёна долараў (на 5,2 %), аб'ём манетарнага золата — 5,9395 мільярда долараў, павялічыўшыся на 225,1 мільёна долараў (на 3,9 %).

Згодна з мэтавымі паказчыкамі грашова-крэдытнай палітыкі, аб'ём міжнародных рэзервовых актываў Беларусі на канец 2025 года павінен складаць не менш як 7,1 мільярда долараў.

# НА 1 РУБЕЛЬ ПРЭФЕРЭНЦЫЙ — 2,6 РУБЛЯ ПАДАТКАЎ І ІНВЕСТЫЦЫЙ

## Развіццё тэрыторый з прэферэнцыйнымі рэжымамі прыносіць карысць як бізнесу, так і дзяржаве

Такое меркаванне выказала намеснік міністра эканомікі Алеся Абраменка ў эфіры «Першага інфармацыйнага» .

Намеснік кіраўніка эканамічнага ведамства адзначыла ўклад рэзідэнтаў свабодных эканамічных зон у агульныя эканамічныя паказчыкі. Па выніках паўгоддзя інвестыцыі ў асноўны капітал выраслі ў 1,3 раза, дасягнуўшы 1 мільярда рублёў, прамых замежных інвестыцый на чыстай аснове — амаль на 13 %, заробкаў — больш чым на 15 %, павялічыліся аб'ёмы выплачаных падаткаў і вытворчасць прамысловай прадукцыі. Чакаецца, што да канца года укладанні рэзідэнтаў перавысяць адзнаку ў 2 мільярды рублёў.



Намеснік міністра эканомікі адказала на пытанні аб самых запатрабаваных ільготах, умовах, пры выкананні якіх можна стаць рэзідэнтам СЭЗ, эканамічных эфектах ад такой дзяржпадтрымкі (на 1 рубель прэферэнцый — 2,6 рубля падаткаў і інвестыцый), укладзе СЭЗ у паказчыкі развіцця рэгіёнаў і выпуск айчынных аналагаў імпартнай прадукцыі, пераліčыла сферы, у якіх рэзідэнты рэалізоўваюць свае праекты.

Таксама ў гутарцы была закранута тэма стратэгічнага планавання развіцця свабодных эканамічных зон:

— На працягу года мы з адміністрацыямі СЭЗ і аблвыканкамамі вызначылі падыходы да фарміравання стратэгій развіцця гэтых тэрыторый да 2030 года. Спіс традыцыйных задач, якія стаяць перад СЭЗ (дыверсіфікацыя экспарту, імпартазамяшчэнне, укараненне высокіх тэхналогій), быў істотна пашыраны. Гаворка ідзе, у прыватнасці, аб пытаннях лакалізацыі, фарміраванні кластараў. Трэба прыцягваць навуку і супрацоўнічаць з лабараторыямі і ВНУ. І, вядома ж, папулярызаваць нашы прэферэнцыйныя рэжымы. Каб усе ведалі, што гэта супрацоўніцтва эфектыўнае і прыносіць карысць як бізнесу, так і дзяржаве, — адзначыла Алеся Абраменка.

# ГРОШЫ Ў СПРАВУ

## «Рэгіянальная ініцыятыва» прапануе новыя магчымасці для малых раёнаў

Пра гэта заявіў начальнік Галоўнага ўпраўлення інвестыцыйнай і будаўнічай дзейнасці Мінэканомікі Дзмітрый КЛІМЯНКОЎ у эфіры «Першага інфармацыйнага», паведамілі ў прэс-службе эканамічнага ведамства.

Паводле яго слоў, бізнес-ідэі, якія сталі часткай «Рэгіянальнай ініцыятывы», маюць права разлічваць на фінансаванне пад 8 % гадавых, а для аграрных раёнаў умовы яшчэ больш выгадныя — 6,5 % гадавых.

Да нядаўняга часу на такую падтрымку маглі прэтэндаваць выключна суб'екты малога і сярэдняга прадпрымальніцтва. Але ў сувязі з ростам цікавасці буйнога бізнесу было прынята рашэнне аб пашырэнні кола атрымальнікаў.

— Разам з тым устаноўлены ліміт крэдытавання — не больш чым 30 мільёнаў рублёў для аднаго інвестпраекта. Гэта зроблена для таго, каб падтрымка не канцэнтравалася на 1-2 вялікіх праектах, а ахапіла як мага больш бізнес-ідэй, забяспечыўшы тым самым раўнамернае развіццё вытворчай інфраструктуры рэгіёнаў, — растлумачыў Дзмітрый Клімянкоў.



Начальнік Галоўнага ўпраўлення распавёў аб крытэрыях уключэння праектаў у пул «Рэгіянальнай ініцыятывы», умовах, пад якія такія бізнес-ідэі могуць атрымаць фінансаванне, назваў сферы дзейнасці, у якіх ужо паступілі заяўкі на рэалізацыю.

— На сёння партфель «Рэгіянальнай ініцыятывы» ўключае каля 60 праектаў коштам каля 700 мільёнаў рублёў са стварэннем больш за 1,3 тысячы працоўных месцаў. Аснова — вытворчая сфера: дрэваапрацоўка, стварэнне будматэрыялаў, харчовая прамысловасць. У сферы аховы здароўя і турызму таксама ёсць паслугі. Гэта значыць, бізнес рэагуе на попыт на гэтыя паслугі і накіраваны на стварэнне гасцінічных комплексаў і іншых інфраструктурных аб'ектаў, — рэзюмаваў Дзмітрый Клімянкоў.




# Мы разам — Беларусь!

**Краіна моцная рэгіёнамі: Любанскі раён**



АКТУАЛЬНА

## «МЫ ЗАЎСЁДЫ ШЧЫРА СУСТРАКАЕМ ГАСЦЕЙ»



Любаншчыну можна без перабольшвання назваць раёнам з развітой інфраструктурай. Мясцовыя арганізацыі і прадпрыемствы працуюць з прыбыткам, ажыццяўляюцца інвестыцыйныя праекты, актыўна развіваюцца сельскагаспадарчая, будаўнічая, сацыяльная, лесагаспадарчая і многія іншыя галіны. Дзякуючы высокім паказчыкам у многіх сферах Любаншчына ўваходзіць у лік найлепшых раёнаў Мінскай вобласці. Пра перспектывы раёна — наша размова са старшынёй Любанскага райвыканкама Віталём ПЛАТУНОМ.

***— Віталь Віктаравіч, раскажыце, калі ласка, пра асноўныя кірункі развіцця Любанскага раёна.***

— Сёлета Любаншчына дэманструе выкананне асноўных даведзеных паказчыкаў сацыяльна-эканамічнага развіцця. Па выніках першага паўгоддзя забяспечана выкананне паказчыкаў па намінальнай налічанай сярэднямесячнай зарплаце, сукупных паступленнях даходаў у бюджэт раёна, інвестыцыях у асноўны капітал, будаўніча-мантажных работах і рознічным тавараабароце.

***— Якія інвестыцыйныя праекты запланавана ажыццявіць у раёне?***

— Адзначу, што інвестыцыйная дзейнасць — гэта ключавы кірунак перспектыўнага развіцця Любанскага раёна. У пералік інвестыцыйных праектаў па праграме «Адзін раён — адзін праект» на 2025 год уключаны два праекты са стварэннем новых рабочых месцаў, адзін з якіх ужо рэалізаваны. У сельскагаспадарчай галіне рэалізаваны тры праекты. Ключавым з'яўляецца праект па будаўніцтве горна-ўзбагачальнага комплексу. Ён значны не толькі для Любанскага раёна, але і для Мінскай вобласці і краіны ў цэлым. Да 2030 года запланаваны будаўніцтва і рэканструкцыя шэрагу сацыяльна значных аб'ектаў Любаншчыны.

***— Будучыня — у руках моладзі. Як на Любаншчыне падтрымліваюць маладыя і шматдзетныя сем'і?***

— На тэрыторыі раёна ажыццяўляецца шэраг дзяржаўных праграм, накіраваных на падтрымку маладых і шматдзетных сем'яў. Сярод іх — Дзяржаўная праграма «Сацыяльная абарона» на 2021—2025 гады, у рамках якой прадугледжаны мерапрыемствы, накіраваныя на аказанне сем'ям або грамадзянам, што маюць патрэбу, дзяржаўнай адраснай сацыяльнай дапамогі ў выглядзе аднаразовай штомесячнай выплаты, харчавання для дзяцей першых двух гадоў жыцця, паслугі сацыяльнага абслугоўвання сем'яў з дзецьмі, а таксама паслугі нянькі.

У рамках Дзяржаўнай праграмы «Рынак працы і садзейнічанне занятасці» на 2021—2025 гады маладым і шматдзетным сем'ям аказваецца дапамога ў працаўладкаванні. Рашэннем райвыканкама штогод устанаўліваецца бронь для працаўладкавання бацькоў са шматдзетных і няпоўных сем'яў.

Ахвотным пачаць свой бізнес прапаноўваецца субсідыя на адкрыццё ўласнай справы, якую ў перыяд з 2021 да 2025 года атрымалі сем шматдзетных бацькоў і 14 маладых людзей.

З мэтай замацавання маладых работнікаў на працоўных месцах меры сацыяльнай падтрымкі прадугледжваюцца ў калектыўных дагаворах.

Дзяржаўная праграма «Здароўе народа і дэмаграфічная бяспека» на 2021—2025 гады ўключае маштабны комплекс мер падтрымкі сем'яў. Так, шматдзетным выплачваецца дапамога ў сувязі з нараджэннем і выхаваннем дзяцей, прызначаецца сямейны капітал, а праца маці заахвочваецца дзяржаўнай узнагародай — ордэнам Маці.

***— Віталь Віктаравіч, якім чынам забяспечваюцца жыллём грамадзяне, што маюць у ім патрэбу?***

— Штогод у раёне ў сярэднім уводзіцца ў эксплуатацыю каля 6 тысяч квадратных метраў жылля, у тым ліку арэнднага, для жыхароў раёна, якія маюць у ім патрэбу, а таксама маладых спецыялістаў.

***— Вядома, што прыгожыя, дагледжаныя вуліцы і дамы — візітка раёна. Раскажыце аб рабоце па добраўпарадкаванні Любаншчыны.***

— Мерапрыемствам, накіраваным на стварэнне і падтрыманне зручнага, бяспечнага, сучаснага і эстэтычна арганізаванага асяроддзя жыццядзейнасці людзей у раёне, удзяляецца асаблівая ўвага. За бягучы перыяд 2025 года праведзены комплексныя работы па добраўпарадкаванні сквера насупраць дзяржаўнай лесагаспадарчай установы «Любанскі лясгас». Тут устаноўлены вулічныя ліхтары, перакладзены тратуарныя дарожкі, заменены і ўстаноўлены сучасныя лаўкі, а таксама пабудаваны фантан. Усё гэта накіравана на стварэнне бяспекі, камфорту і якаснага адпачынку жыхароў горада. Абноўлены сквер — значны ўнёсак у развіццё гарадской інфраструктуры. Грунтоўныя работы праведзены таксама па добраўпарадкаванні аб'екта «Мемарыяльны комплекс «Камсамольцам і моладзі Любаншчыны» і помніка Ф. Г. Конанавай. Устаноўлена дэкаратыўнае асвятленне, уладкаваны тратуарныя дарожкі і абноўлена канструкцыя комплексу. На гарадской тэрыторыі таксама праведзены капітальны рамонт двух шматкватэрных жылых дамоў. У цяперашні час вядуцца будаўніча-мантажныя работы будынка інтэрната, размешчанага ў Любані. Таксама ўзводзяцца аб'екты «Будаўніцтва сетак ліўневай каналізацыі ў г. Любань», 1-я чарга (1-ы, 2-і, 3-і і 4-ы пускавыя комплексы), а таксама аб'екта «Добраўпарадкаванне з устройствам ліўневых каналізацый у мікрараёне (вул. Леніна, Савецкая, Янкі Купалы і завулак Пралетарскі) у г. Любань Мінскай вобласці, уключаючы праектна-даведачныя работы».

Завершаны работы па добраўпарадкаванні цэнтральнай часткі горада, мемарыяльнага комплексу «Востраў Зыслаў» і брацкай магілы ахвяр генацыду. Вядзецца добраўпарадкаванне гарадскога пасёлка Урэчча перад правядзеннем раённага свята «Дажынкі-2025». Тут запланавана добраўпарадкаваць зону адпачынку, паркоўку, а таксама зрабіць рамонт фасаду будынкаў. Цяпер вядуцца рэканструкцыя і добраўпарадкаванне парку культуры і адпачынку ў Любані.

Чысты, утульны і дагледжаны, Любанскі раён уражвае прыгажосцю. Мы заўсёды шчыра сустракаем гасцей і імкнёмся зрабіць усё магчымае, каб наш край у кожнага пакінуў самыя прыемныя ўражанні.

**Святлана СІЛЬВАНОВІЧ.**


Фота Алены ДАЎЖАНОК





## УРАДЖАЙ ЁСЦЬ, ПЛАНЫ — ГРАНДЫЁЗНЫЯ

### У якім напрамку рухаецца АПК Любаншчыны

Сельская гаспадарка Любанскага раёна дэманструе стабільную дынаміку развіцця. Аб гэтым, а таксама аб вектарах далейшай работы мы пагаварылі з першым намеснікам старшыні — начальнікам упраўлення па сельскай гаспадарцы і харчаванні Любанскага райвыканкама Жаннай АЛІШЭВІЧ.



— У раёне пад збожжавыя, каласавыя без грэчкі і проса выдзелена 15 322 гектары. 28 жніўня работы па ўборцы былі поўнасцю завершаны. Сярэдняя ўраджайнасць вышэйшая за леташнюю на 8,7 %. Для нас гэта вялікае дасягненне, асабліва ўлічваючы ўмовы надвор'я, — падзялілася яна.

У раёне таксама ідзе зладжаная работа па нарыхтоўцы кармоў. Ужо нарыхтавана 19 кармавых адзінак на ўмоўную галаву. Для параўнання: летась гэты паказчык склаў 18.

Жанна Леанідаўна падзялілася і амбіцыйнымі планамі на будучыню:

— Стараемся зрабіць усё магчымае, каб выканаць прэзідэнцкую праграму і перавесці да 2030 года буйную рагатую жывёлу з прывязнога ўтрымання на тэхналагічныя комплексы. На жаль, сёння прывязное ўтрыманне складае 32 %. У такіх умовах вельмі складана стабільна даваць высокія тэмпы росту малака.

Тым не менш работа вядзецца і ўжо ў лютым 2025 года ў раёне адкрылі першую чаргу МТК «Дупелка» ў ААТ «БВА».

**— На сённяшні момант там доіцца 560 кароў асноўнага статка. Увогуле праектная магутнасць пасля завяршэння ўсіх работ складзе 1000 жывёл. Работы ідуць дастаткова высокімі тэмпамі. Добра, што дзяржава падтрымлівае і дае фінансы на гэта, — адзначыла намеснік старшыні.**

Больш за тое, у раёне будуецца комплекс «Сарачы» на 800 галоў у ААТ «Імя К. І. Шаплыка». У наступным годзе ён ужо будзе функцыянаваць.

— У найбліжэйшай будучыні таксама плануецца будаўніцтва ў КСУП «Таліца-агра» агракомплексу на 800 галоў і будаўніцтва ў ААТ «Забалоцкі» комплексу па дойным пагалоўі на 2400 галоў, — дадала Жанна Алішэвіч.

Адным словам, аграрная галіна Любаншчыны ідзе ў нагу з часам, тут імкнуцца падтрымліваць гаспадаркі і рабіць усё магчымае для атрымання найлепшых вынікаў, што ў будучым абавязкова адкрые новыя цікавыя перспектывы.

**Лізавета ГОЛАД,**
**фота аўтара.**

# БЫЦЬ ПЕРШЫМІ СЯРОД НАЙЛЕПШЫХ

## Любанскае райспажыўтаварыства не страчвае пазіцыі лідара на працягу многіх гадоў

**Сфера гандлёвага абслугоўвання насельніцтва ў наш час атрымала актыўнае развіццё. Не толькі ў буйных, а і ў невялікіх гарадах працуе шмат гандлёвых прадпрыемстваў розных форм уласнасці. Канкурэнцыя паміж гандлёвымі пунктамі толькі ўзрастае. Для таго каб не страціць даверу пакупнікоў і быць заўсёды ў ліку першых, трэба прыкласці нямала намаганняў.**



Старшыня праўлення Любанскага райспажыўтаварыства Мікалай КОРБУТ.

У канцы жніўня Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка сабраў нараду па пытаннях эфектыўнасці сістэмы гандлёвага абслугоўвання насельніцтва ў маштабах Беларусі. Прэзідэнт падверг аб'ектыўнай крытыцы работу сістэмы Белкаапсаюза. Як адзначыў кіраўнік дзяржавы, гандлёвае абслугоўванне жыхароў невялікіх населеных пунктаў павінна быць такім жа якасным, як і гараджан.

Але, як і ў любой сістэме, многае залежыць ад людзей на месцах. Так, на сённяшні дзень у сістэме Белкаапсаюза ёсць нямала праблемных пытанняў, над якімі трэба працаваць. Якім чынам пераадольваюцца цяжкасці, звязаныя з недахопам кадраў, узнікаючай канкурэнцыяй і г. д. у Любанскім райспажыўтаварыстве, мы даведаліся, наведаўшы шэраг гандлёвых аб'ектаў раённага цэнтра.

Нягледзячы на высокі ўзровень канкурэнцыі — на тэрыторыі раёна працуюць дзясяткі прадпрыемстваў іншых сетак, — магазіны Любанскага райспажыўтаварыства з гандлёвай маркай «Родны кут» толькі набіраюць папулярнасць сярод пакупнікоў. Гэта сведчыць аб прафесіяналізме кіраўніка і зладжанай працы калектыву. У чым жа сакрэт высокай канкурэнтаздольнасці магазінаў? На гэта пытанне мы папрасілі адказаць **старшыню Любанскага райспажыўтаварыства Мікалая КОРБУТА.**

Фота Алены ДАЎЖАНОК.



Прадавец аўталаўкі № 5 Жанна МІЛАШ рыхтуецца да выезду на маршрут.

### ГОНАР ПРАДПРЫЕМСТВА — УЛАСНАЯ ПРАДУКЦЫЯ

«У склад Любанскага райспажыўтаварыства ўваходзіць 120 гандлёвых прадпрыемстваў, у тым ліку восем аўтамагазінаў, — расказвае Мікалай Іванавіч. — Дзейнасць райспажыўтаварыства разгорнута на тэрыторыі чатырох раёнаў: Старадарожскага, Любанскага, Слуцкага і Салігорскага. Мы займаемся гандлёвым абслугоўваннем і жыхароў дробных гандлёвых пунктаў, і аграгарадкоў. Кірункамі нашай работы з'яўляюцца рознічны гандаль і грамадскае харчаванне. Вялікую ўвагу ўдзяляем таксама нарыхтоўчай і прамысловай дзейнасці. Зразумела, што менавіта ўласная прамысловасць дазваляе працаваць з прыбыткам, дасягаць высокіх фінансавых паказчыкаў. Значным попытам сярод пакупнікоў карыстаюцца хлебабулачныя вырабы, якія вырабляюцца на хлебазаводзе пры нашым райспажыўтаварыстве. За дзень тут выпускаецца больш за 35 відаў прадукцыі. Вельмі палюбіліся пакупнікам булка «Разан», багет. Нядаўна мы пачалі выпякаць чыабату, якую надта ахвотна набываюць пакупнікі. Акрамя таго, выпускаем невялікі працэнт каўбасных вырабаў.

Нашым сапраўдным гонарам з'яўляецца мінеральная вада «Старадарожская», якая здабываецца на глыбіні 300 метраў пад зямлёй, праходзіць газіфікацыю і з'яўляецца лячэбна-сталовай. Мінеральная вада дапамагае ў лячэнні захворванняў страўнікава-кішачнага тракта, аднаўленні арганізма пасля хвароб. Вельмі прыемна, што мінеральная вада «Старадарожская» папулярная не толькі сярод мясцовых жыхароў, а і ва ўсёй краіне.

Калі казаць пра аб'екты грамадскага харчавання, сюды адносяцца 11 прадпрыемстваў на 715 пасадачных месцаў. Гэта два рэстараны, дзве кавярні, дзве сталовыя, буфет, два кафетэрыі і сем магазінаў «Кулінарыя». Летась мы правялі рэканструкцыю сталовай «Світанак-1». Цяпер гэта сучасны будынак з новымі абсталяваннем, мэбляй і прыгожым інтэр'ерам. Сталовую з задавальненнем наведваюць і моладзь, і людзі пажылога ўзросту.

Мэтанакіраваная работа па мадэрнізацыі аб'ектаў грамадскага харчавання, гандлёвага абслугоўвання дае магчымасць дасягаць значных паказчыкаў. Тэмп росту тавараабароту за сем месяцаў бягучага года склаў адзін мільён 936 тысяч рублёў, тэмп росту ў параўнанні з адпаведным перыядам мінулага года дасягнуў 102 %.

Трэба адзначыць, што хлебабулачныя вырабы выпускаюцца не толькі Любанскім хлебазаводам, а і аб'ектамі грамадскага харчавання. Свежым хлебу і булкам пакупнікі аддаюць перавагу на працягу многіх гадоў.

### ЭТАП АЎТАМАТЫЗАЦЫІ ПРОЙДЗЕНЫ

Напэўна, бягучы год быў пераломным не толькі для Любанскага райспажыўтаварыства, а і для ўсёй краіны, паколькі патрэбна было перайсці на сістэму аўтаматызацыі працэсу ўсіх гандлёвых прадпрыемстваў.

«Прызнаюся шчыра, гэты працэс быў для нас вельмі нялёгкі, паколькі 20 % прадаўцоў Любанскага райспажыўтаварыства дасягнулі пенсіённага ўзросту, — расказвае Мікалай Корбут. — Пераканаць людзей, якім больш за 65 гадоў, у важнасці работы ў сістэме аўтаматызацыі было вельмі праблематычным. Аднак не ўсё так цяжка, як падаецца на першы погляд. Разабрацца ў сістэме аўтаматызацыі магчыма, неабходныя навыкі прадавец можа лёгка засвоіць.

Лічу, што ўсе новаўвядзенні вельмі важна спасцігаць, таму што дасягнуць поспеху магчыма толькі тады, калі ісці ў нагу з часам.

### НА ПРЫЛАЎКАХ — СВАЁ, БЕЛАРУСКАЕ

Важным аспектам з'яўляецца і тое, што Любанскае райспажыўтаварыства актыўна падтрымлівае айчынных вытворцаў. Згодна з Рэкамендацыямі, прынятымі Міністэрствам антыманапольнага рэгулявання, забяспечанасць гандлёвых прадпрыемстваў сістэмы Белкаапсаюза павінна складаць 85 %. Прыемна адзначыць, што наяўнасць тавараў айчыннай вытворчасці ў гандлёвых прадпрыемствах Любанскага райспажыўтаварыства складае 92 %.

«Мы імкнёмся працаваць толькі з беларускімі вытворцамі прадукцыі, — адзначае **намеснік старшыні Любанскага райспажыўтаварыства Аксана РАШЧЭНЯ.** — У нашых магазінах працуе мноства фірменных секцый: ААТ «Чырвоны харчавік», «Камунарка», СП ААТ «Спартак», кандытарскай фабрыкі «Віцьба». У ліпені бягучага года мы адкрылі таксама фірменную секцыю Ашмянскага мясакамбіната.



Прадавец Вольга БЕРАЗОЎСКАЯ выкладвае кандытарскія вырабы ў краме «Родны кут».

Вельмі важна і тое, што на працягу дзесяцігоддзяў Любанскае райспажыўтаварыства працуе з прыбыткам. І ў рабоце па арганізацыі рознічнага гандлю, і ў галінах прамысловасці, нарыхтовак, знешняй эканомікі і агульнагаспадарчай дзейнасці мы заўсёды мелі нядрэнныя вынікі. Паўтаруся, што гэты год для нас стаў пераломным. Паколькі ў перыяд правядзення працэсу аўтаматызацыі магазіны райспажыўтаварыства не працавалі на працягу тыдня, нам прыйшлося панесці страты ў тавараабароце. Спыніць працэс адставання няпроста, але першачарговай задачай Любанскага райспажыўтаварыства з'яўляецца абслугоўванне дробных населеных пунктаў, дзе колькасць жыхароў складае менш за 200 чалавек. Як паказвае практыка, аўталаўка не можа выканаць тавараабарот, якога можа дасягнуць нават маленькая крама. Аднак мы клапоцімся аб жыхарах вёсак і ў любой сітуацыі імкнёмся задаволіць іх патрэбы. Імкнёмся захаваць нашу дзейнасць у дробных населеных пунктах, пашырыць унутрыгрупавы асартымент тавараў у аграгарадках. Так, у нашых магазінах, якія працуюць у сельскай мясцовасці, ёсць у продажы і ахалоджаная птушка, і замарожаная, і ахалоджаная рыба. Гэтыя прадукты заўсёды ахвотна набываюць пакупнікі. За месяц мы прадаём 20 тон птушкі, восем тон рыбы, а таксама 15 тон агароднiны. Аднак мы не спыняемся на дасягнутым. Любанскае райспажыўтаварыства заўсёды ідзе насустрач усім новаўвядзенням, сучасным фарматам. Мы імкнёмся пастаянна абнаўляць асартымент прадукцыі: выпускаем новыя віды хлеба, кандытарскіх вырабаў. Цікавімся, што з'явілася новага ў нашых калег.



Прадавец Валянціна ВЯРОЎКІНА дэманструе гатовую кулінарную прадукцыю ўласнай вытворчасці.

Безумоўна, у нашай рабоце не абыходзіцца без цяжкасцяў. На сённяшні дзень мы працуем над вырашэннем кадравых пытанняў. Не ўсе магазіны, у прыватнасці ў маланаселеных і аддаленых вёсках, забяспечаны прадаўцамі. Райспажыўтаварыства адчувае недахоп прадаўцоў, кухараў і кіроўцаў. У васьмі гандлёвых аб'ектаў пакуль не вядзецца раздзельнага ўліку тавараў. Аднак цалкам завяршыць працэс аўтаматызацыі разліку ў магазінах мы плануем да канца года. На працягу 2022—2023 гадоў у Любанскім раёне было адкрыта больш за 300 гандлёвых аб'ектаў іншых прадпрыемстваў. Мы вытрымалі канкурэнцыю з магазінамі вялікіх сеткавых рытэйлаў. Вядома, нямала пакупнікоў набываюць тавары праз маркетплейсы. Аднак усе перашкоды мы імкнёмся перамагчы».

Самае ж галоўнае, што калектыў райспажыўтаварыства складаецца з людзей, якія добра ведаюць і любяць сваю справу. Многія прысвяцілі прадпрыемству не адзін дзясятак гадоў і ў цяперашні час застаюцца вернымі рабоце ў гандлі. Напэўна, гэта і з'яўляецца галоўным сакрэтам поспеху прадпрыемства, якое мае значны вопыт у абслугоўванні пакупнікоў і мэтанакіравана працуе над павелічэннем прэстыжу гандлёвай галіны.






Кухар Аксана БАРАНОЎСКАЯ прымае заказы ў закусачнай «Лепім самі».

**Святлана СІЛЬВАНОВІЧ.**
**Фота Лізаветы ГОЛАД.**

УНП 6000358416



Прыемны адпачынак ва ўтульнай «Хаце паляўнічага» забяспечаны.

# ДОМ ПАЛЯЎНІЧАГА ПРЫЦЯГВАЕ ГАСЦЕЙ

## Любанскі раён уражвае шматлікіх гасцей сваімі непаўторнымі краявідамі

Густыя косы хваёвых лясоў, якія абрамляюць азёры і рака, нікога не пакідаюць раўнадушным. Для таго каб адпачыць, атрымаць зарад бадзёрасці і новых сіл, сюды прыязджаюць не толькі жыхары Беларусі, а і расіяне, жыхары іншых краін. Гасцінная Любаншчына надоўга застаецца ў памяці кожнага. Захаванне гэтай лясной прыгажосці, ахова зялёных багаццяў ад пажараў — адны з кірункаў дзейнасці Любанскага лясгаса. Пра тое, чым сёння можа па праве ганарыцца ўстанова, мы папрасілі расказаць **дырэктара Любанскага лясгаса Сяргея ШУЛЯКОЎСКАГА.**

«Галоўнае багацце Любанскага лясгаса — гэта людзі, адказныя работнікі, многія з якіх аддалі рабоце ў арганізацыі не адзін дзясятак год і сталі прадаўжальнікамі працоўных дынастый. Працоўны калектыў лясгаса складае каля 400 чалавек. У склад арганізацыі ўваходзяць дзевяць падраздзяленняў, восем лясніцтваў, а таксама дрэваапрацоўчы цэх, гадавальнік, паляўнічая гаспадарка і лесапункт. Вядома, высокія паказчыкі працы кожнага падраздзялення — гэта вынік адказнай работы спецыялістаў. Таму Любанскі лясгас ганарыцца сапраўднымі прафесіяналамі.

Штогод у нас праводзяцца ўрачыстыя мерапрыемствы, прысвечаныя Дню работніка лясной гаспадаркі, падчас якіх мы ўручаем узнагароды нашым перадавым работнікам. Гэта і аператары хар-

**Адкрытае акцыянернае таварыства «Асавец-агра»**, якое дзейнічае на тэрыторыі Любанскага раёна Мінскай вобласці, — гэта шматпрофільнае сельскагаспадарчае прадпрыемства, арыентаванае на комплексную вытворчасць прадуктаў харчавання. Тут вядзецца вытворчасць мяса-малочнай прадукцыі і буйной рагатай жывёлы, вырошчваюцца збожжавыя і зернебабовыя культуры, кукуруза і рапс. Акрамя раслінаводства і жывёлагадоўлі, таварыства займаецца перапрацоўкай кармавых культур для буйной рагатай жывёлы.

# ДЗЕ НАРАДЗІЛІСЯ, ТАМ І СПАТРЭБІЛІСЯ

Фота Алены ДАЎЖАНОК.





Дырэктар Уладзімір КЛІМОВІЧ.


Калектыў адміністрацыі гаспадаркі. Злева направа: сакратар Юлія КРАЎЦОВА, інжынер па ахове працы Вера БЕГУНЕЦ, бухгалтар Марына ГЕРЦМАНОВІЧ, галоўны бухгалтар Вольга ЧЭРКАС, бухгалтары Алеся КЛІМОВІЧ і Ірына ГУК, юрыст-кансультант Сяргей ЕРМАЛІЦКІ.

На працягу дзевяці апошніх гадоў прадпрыемствам кіруе Уладзімір Клімовіч, прадаўжальнік сямейнай працоўнай дынастыі механізатараў, які аддаў рабоце ў сельскай гаспадарцы больш за трыццаць гадоў.

**— Уладзімір Аляксандравіч, вядома, што ваша прадпрыемства працуе з прыбыткам і на працягу многіх гадоў упэўнена трымае планку лідара сельскагаспадарчай вытворчасці. Што дапамагае вам заўсёды быць у ліку першых?**

— У гэтым дапамагаюць самі работнікі прадпрыемства — наша галоўнае багацце. Калектыў складаецца з людзей, якія добра ведаюць сваю справу. Многія з іх прысвяцілі рабоце ў сельскай гаспадарцы не адзін дзясятак гадоў і свой працоўны вопыт ахвотна перадаюць маладым спецыялістам.

Імкнёмся актыўна асвойваць новыя тэхналогіі, вядзём работу па мадэрнізацыі сельскагаспадарчых будынкаў. Так, напрыклад, у 2022 годзе пабудавалі новы малочнатаварны комплекс «Асавец». Сярэднясутачны надой на карову тут складае 23 літры, а ў цэлым па гаспадарцы — 18 літраў.

Дзякуючы рэканструкцыі будынкаў практыкуем беспрывязное ўтрыманне жывёлы. Такім чынам, каровы не выганяюцца ў поле, а знаходзяцца на фермах, мы не выкарыстоўваем перасоўныя даільныя ўстаноўкі.

На працягу года ў таварыстве працуюць дзве брыгады будаўнікоў, якія займаюцца рэканструкцыяй ферм. Акрамя таго, развіваем дзейнасць па аказанні турыстычных паслуг. Так, год таму нам быў перададзены будынак базы адпачынку «Дзікае». Летась зрабілі рэканструкцыю аднаго доміка, пабудавалі альтанку. Сёлета тут ужо ўзводзіцца лазня. Паколькі база адпачынку размешчана ў прыгожым жывапісным месцы, у атачэнні зеляніны лясных дрэў, непадалёк ад вадасховішча, гэта прыцягвае шматлікіх гасцей. Калі ў будныя дні тут яшчэ можна заказаць адпачынак, то выхадныя занятыя да кастрычніка. На базу прыязджаюць не толькі жыхары Любаншчыны, суседніх абласцей, але і ўсёй краіны.

Асноўны ўпор у сваёй дзейнасці мы, вядома, робім на жывёлагадоўлю, развіццё якой немагчыма без раслінаводства. Маем больш за 10 тысяч гектараў зямлі і кармы для жывёлы нарыхтоўваем самі.

**— Не менш важная работа з маладымі спецыялістамі. Як папаўняецца штат прадпрыемства маладымі кадрамі?**

— Сёлета ў нас пачалі свой працоўны шлях шасцёра маладых спецыялістаў: адзін інжынер, адзін аграном, два ветфельчары і двое трактарыстаў. Наш малады інжынер родам з Любанскага раёна, праходзіў навучанне па мэтавым накіраванні і праяўляе сябе адказна і добрасумленна. Прызначылі яго загадчыкам майстэрняў. У свой час, калі мы праводзілі прафарыентацыі ў Ямінскай сярэдняй школе, дырэктар параіла пагутарыць з адным з актывістаў навучальнай установы Уладзіславам Шчарбачэнем. Яго дзядуля працаваў у гаспадарцы ветурачом, і я прапанаваў хлопцу пайсці па яго слядах. Аднак Уладзіслаў сказаў, што жадае быць інжынерам. Мы далі яму мэтавае накіраванне, хлопец скончыў вышэйшую навучальную ўстанову і цяпер працуе загадчыкам майстэрняў. Па мэтавым накіраванні праходзіў навучанне і адзін з механізатараў Арцём Ісайка.


Галоўны ветурач Вера КАЎГАРЭНЯ, брыгадзір Людміла БЕЛАНОГАВА, намеснік дырэктара па жывёлагадоўлі Алег МУРАВЕЙКА і выконваючы абавязкі галоўнага заатэхніка Дзіяна ПЫЛІК здзяйсняюць вячэрні абход дойнага пагалоўя.

Хлопец скончыў Любанскі сельскагаспадарчы каледж і ў цяперашні час працуе на збожжаўборачным камбайне. Паколькі Арцёму трэба будзе праходзіць службу ў арміі, мы пахадайнічаем аб накіраванні яго на альтэрнатыўную службу.

Каб маладыя спецыялісты маглі хутка асвоіцца, практыкуем настаўніцтва — замацоўваем за імі вопытных спецыялістаў, якія даюць карысныя парады, дапамагаюць укараніць атрыманыя тэарэтычныя веды ў практыку. За Уладзіславам Шчарбачэнем замацаваны галоўны інжынер, які вельмі задаволены яго работай. Працу двух ветфельчараў курыруе галоўны ветурач таварыства, работу агранома — галоўны аграном. Штодзень аграном працуе ў полі, сочыць за правядзеннем уборачных работ.

**— Уладзімір Аляксандравіч, вы з'яўляецеся прадаўжальнікам працоўнай сямейнай дынастыі...**

— У маёй працоўнай кніжцы ўсяго адзін запіс. Любоў да работы ў сельскай гаспадарцы прывілі бацькі. Тата ўсё жыццё працаваў у гэтай жа гаспадарцы трактарыстам, а маці шчыравала ў паляводчай брыгадзе, пазней была загадчыцай клуба. Скончыўшы Мар'інагорскі аграрна-тэхнічны каледж імя У. Е. Лабанка, я адслужыў у арміі і прыйшоў працаваць у родную гаспадарку. Тры гады быў трактарыстам, а затым мяне прызначылі брыгадзірам трактарнай брыгады. Тры гады я працаваў намеснікам дырэктара, затым тры гады выконваў абавязкі дырэктара прадпрыемства, і вось з 2016 года кірую ім. Так склалася, што работа ў сельскай гаспадарцы, на родным прадпрыемстве, стала важнай часткай майго жыцця. Я люблю сваю работу і імкнуся аб'яднаць у калектыве адказных, мэтанакіраваных людзей, якія ў сельскай гаспадарцы знайшлі прызванне. Такіх у нас нямала. Многія работнікі таварыства родам з Любанскага раёна. Як кажуць, дзе нарадзіліся — там і спатрэбіліся. Высокага прафесійнага ўзроўню дасягнуў галоўны аграном таварыства Андрэй Дарожка, добра ведае сваю справу галоўны інжынер Сяргей Бегунец... Спіс выдатных работнікаў можна працягваць доўга.

**— Належныя ўмовы працы, несумненна, дапамагаюць дасягнуць высокіх працоўных паказчыкаў...**

— Значныя паказчыкі мы атрымалі на ўборцы збожжа. На сёння ў параўнанні з мінулым годам мы намалацілі збожжа на адну тысячу тон больш. Мяркуем атрымаць яшчэ 300 тон. Усяго намалацілі восем тысяч тон збожжа, не ўлічваючы грэчку. Для паспяховага правядзення збожжаўборачных работ у нас ёсць усё неабходнае: працуе восем збожжаўборачных камбайнаў, сярод якіх магутны «Гомсельмаш 2124», у страі ўжо чацвёрты сезон. Сярод камбайнаў, якія выкарыстоўваюцца шмат гадоў, «Glass Mega 350». Астатнія ж маркі КЗС-1218 «Палессе GS 12».

Мы маем сваю сталовую, трымаем на адкорме больш за дзве тысячы галоў быкоў і таму маем уласную мясную прадукцыю. Для прыгатавання абедаў супрацоўнічаем з ААТ «Слуцкі мясакамбінат», адкуль атрымліваем каўбасныя вырабы і г. д. Стравы для работнікаў гатуе прафесійны повар Ірына Шчарбачэня. Для працаўнікоў жніва арганізавана двухразовае харчаванне. Абеды аператыўна дастаўляюцца ў поле. З зарплаты работнікаў утрымліваецца ўсяго 20 % кошту абеду. Паколькі большасць прадуктаў у нас свая, іх сабекошт нізкі. У сярэднім цана абеду складае адзін рубель і менш. Маюцца ўласныя душавыя.


Камбайнер Сяргей ЧУГАН падчас гэтай уборачнай намалаціў больш за тысячу тон збожжа.

З гонарам адзначу, што сёлета ў нас ужо ёсць тры экіпажы камбайнераў-тысячнікаў, на адвозцы збожжа — чатыры: трое кіроўцаў аўтамабіляў і адзін трактарыст.

Кругласутачна вядзецца дзяжурства на збожжатаках, работнікі працуюць пазменна. Вынікі жніва па традыцыі падводзяцца ў час абласнога свята працаўнікоў вёскі «Дажынкі». Для сваіх работнікаў рыхтуем падарункі — наборы прадуктаў. Згодна з калектыўным дагаворам, для працаўнікоў таварыства, якія маюць патрэбу, прадугледжана фінансавая дапамога. Да дзесяці базавых велічынь работнікі атрымліваюць па прычыне працяглай хваробы, нараджэння дзіцяці або страты блізкага чалавека. Пры неабходнасці аказваецца таксама і дапамога транспартам.

— Упэўнена, што дзякуючы вашай прафесійнай ініцыятыве, мэтанакіраванасці і плённай працы работнікаў усе акрэсленыя планы абавязкова ўдасца ажыццявіць.

**Святлана СІЛЬВАНОВІЧ.**
**Фота Лізаветы ГОЛАД.**


Будаўнічая брыгада гаспадаркі ўзводзіць лазню на тэрыторыі базы адпачынку «Дзікае». Злева направа: будаўнікі Мікалай ГЕРМАНОВІЧ, Іван САНОЦКІ, Сяргей ПЯШКО.


Дом адпачынку на базе.

УНП 600020824

вестэраў, фарвардэраў, ляснічыя, якія ўзначальваюць найлепшыя калектывы, вальшчыкі лесу, кіроўцы... Прыемна адзначыць, што наш **начальнік гадавальніка Валянціна СКРЫГАН** мае званне «Ганаровы лесавод».

*— Сяргей Аляксандравіч, многія жыхары краіны добра ведаюць пра паляўнічую гаспадарку Любанскага лясгаса. Яна прыцягвае ўвагу шматлікіх гасцей. Чым жа адметная ваша паляўнічая гаспадарка?*

— Яна невялікая па памерах, знаходзіцца ў паўднёвай частцы Мінскай вобласці, яе плошча складае каля 40 тысяч гектараў. Угоддзі размешчаны кампактна. За належным парадкам на тэрыторыі паляўнічай гаспадаркі сочаць двое егераў. Яны забяспечаны ўсім неабходным і для правядзення рэйдавых і біятэхнічных мерапрыемстваў, маюць арэндную зброю. Узначальвае калектыў егераў **паляўніцтвазнавец Мікалай ГІНЬКО.**

Наша паляўнічая гаспадарка адметная тым, што каля дзесяці гадоў таму мы пачалі ўдзельнічаць у Дзяржаўнай праграме «Беларускі лес» на 2021—2025 гады. Праграма ажыццяўляецца з мэтай садзеяння развіццю лесагаспадарчай галіны, эфектыўнага выкарыстання лясных рэсурсаў, захавання экалагічнай і сацыяльнай ролі лясоў.

Акрамя таго, некалькі гадоў таму мы завезлі адну папуляцыю лані еўрапейскай. Гэта вельмі прыгожая жывёла, самцы якой маюць добрыя трафейныя якасці. Значных вынікаў у правядзенні палявання на іх пакуль няма, але гэта робіць нашу паляўнічую фаўну яшчэ больш разнастайнай.

Паляўнічая гаспадарка можа развівацца толькі пры наяўнасці добрай інфраструктуры. Адным з яе важных складнікаў з'яўляецца наяўнасць Дома паляўнічага — месца, дзе створаны выдатныя ўмовы для адпачынку. Дом паляўнічага Любанскага лясгаса знаходзіцца ў найпрыгажэйшым месцы, непадалёк ад санаторыя «Світанак-Любань». Будынак разлічаны на 19 ложка-месцаў. Для гасцей створаны камфортныя ўмовы пражывання. Тут ёсць лазня, альтанка з комплексам для гатавання барбекю, якім можна скарыстацца і ў летні, і ў зімовы час. Для прыхільнікаў актыўнага ладу жыцця створаны вяровачны гарадок, нядаўна тут з'явілася экасцежка. У Доме паляўнічага ёсць і маразільная камера для здабытых трафеяў.


Канферэнц-зала для правядзення мерапрыемстваў.

Кожны з гасцей тут будзе адчуваць сябе ўтульна і камфортна.

Планамерную работу па развіцці інфраструктуры паляўнічай гаспадаркі мы будзем працягваць і далей. Мы заўсёды рады бачыць гасцей, якія змогуць цудоўна правесці вольны час на ўлонні прыроды і атрымаць шмат прыемных уражанняў.

**Святлана СІЛЬВАНОВІЧ,**
**Фота Лізаветы ГОЛАД.**

# ПРАЦУЮЦЬ ПРАФЕСІЯНАЛЫ

## Як справы на ААТ «Забалоцкі»

У паўночна-заходняй частцы раёна размясцілася адна з найбуйнейшых гаспадарак Любаншчыны: ААТ «Забалоцкі», які ўваходзіць у склад холдынга «Беларуськалій-Агра». Мы наведалі прадпрыемства, паглядзелі на яго бязмежныя палі, пазнаёміліся з передавікамі працы і ўбачылі сучасныя адкрытыя пляцоўкі для буйной рагатай жывёлы. Але пра ўсё па парадку.



Дырэктар Міхаіл ВЕЧАР.



Старшы камбайнер, двухтысячнік Алег ЛАПАНОВІЧ і камбайнер Арсень ДРАБУЦЬКА падчас уборкі азімай пшаніцы.



### НА ПРАСТОРАХ ПАЛЁЎ

Ворныя землі гаспадаркі займаюць плошчу ў 9144 га. Вялікія абшары з году ў год цешаць добрым ураджаем.

— У нас уборачная плошча складае 4070 га толькі збожжавых, а калі браць з рапсам, то 5300 га. Гэта адна з самых вялікіх уборачных плошчаў нашага раёна. Сёлета мы атрымалі вал 3000 тон збожжа рапсу, што вельмі сур'ёзна таксама і ў грашовым выражэнні, — адзначыў **дырэктар гаспадаркі Міхаіл ВЕЧАР.**

Падчас нашага візіту яшчэ ішла гарачая пара ўборачнай, таму хутка мы адправіліся ў палі. На ўрочышчы «За Ігнатам» кружылі экіпажы сельскагаспадарчай тэхнікі, нібыта спаборнічаючы адзін з адным у хуткасці і майстэрстве.



Галоўны аграном Генрых РАМАНЧУК на ўрочышчы «За Ігнатам».

— Людзі ў нас выдатныя. Камбайнеры — сапраўдныя прафесіяналы сваёй справы. Такіх працаўнікоў трэба яшчэ пашукаць. З дзесяці экіпажаў у нас шэсць чалавек з вышэйшай адукацыяй. Увогуле, тут вельмі сур'ёзны адбор на камбайн, — падзяліўся дырэктар.

Паводле яго слоў, камбайнер абавязкова павінен быць дысцыплінаваным і тэхнічна падрыхтаваным на 100 %.

— Таксама ён павінен быць мэтанакіраваным і адказным. Чалавеку трэба дакладна разумець, што такое — убіраць хлеб. А наогул сёння камбайнерам працаваць вельмі ганарова і прыбытковa. Галоўнае, каб была любоў да сельскай гаспадаркі, калі яе няма, то тут і рабіць няма чаго, — заключыў Міхаіл Вечар.

Ёсць у ААТ «Забалоцкі» перадавік, найлепшы не толькі ў гаспадарцы, але і ва ўсім раёне: двухтысячнік **Алег ЛАПАНОВІЧ.** Хутка яго камбайн спыніўся недалёка ад нас, і нам удалося з ім паразмаўляць. Аказалася, што за ўсе 4 гады работы на прадпрыемстве Алег Лапановіч заўсёды быў першы.

— У чым сакрэт такіх добрых вынікаў? Напэўна, у згуртаванай працы з напарнікамі і добрай тэхніцы, якая не падводзіць. Спачатку я два гады працаваў з сынам, потым з сябрам, а цяпер восьр з пляменнікам Арсенем Драбуцькам. Хлопец скончыў 11 класаў, атрымаў правы механізатара і перад пачаткам вучобы ва ўніверсітэце вырашыў далучыцца да жніва, — расказаў ён.

Любоў да сельскай гаспадаркі перадавік літаральна ўвабраў з малаком маці, якая ўсё жыццё прапрацавала галоўным бухгалтарам тут. Бацька таксама працаваў у гаспадарцы механізатарам.

Пазнаёміліся мы і з **галоўным аграномам Генрыхам РАМАНЧУКОМ.** Ён на прадпрыемстве працуе другі год і сёлетні ўраджай — вынік яго карпатлівай працы.

— Усё вельмі добра: ураджаю атрымліваем больш, чым у мінулым годзе, — падзяліўся ён.

Сам Генрых Раманчук ужо з малых гадоў ведаў, з чым звяжа сваё жыццё.

— Я сам вясковы, з дзяцінства з сельскай гаспадаркай сутыкаўся, таму калі ўстаў выбар прафесіі, усё пайшло ў бок аграноміі. Вельмі цікава прадумваць, дзе што пасеяць і які гэта дасць ураджай, — адзначыў ён.



### УСЁ ЛЕПШАЕ Ў АДНЫМ МЕСЦЫ

Цешыць поспехамі і жывёлагадоўчы кірунак. Так, у склад гаспадаркі ўваходзіць 5 мяса-малочных ферм, на якіх утрымліваецца больш за 8,5 тысячы галоў жывёлы. Штодзень тут рэалізуецца 23 тоны малака, за месяц — 690 тон. Асноўны аб'ём прадукцыі адпраўляецца на Любанскі філіял ААТ «Слуцкі сыраробны камбінат».

Мадэрнізацыя тут вядзецца рэгулярна. Нядаўна ў гаспадарцы з'явіліся адкрытыя пляцоўкі сезоннага адкорму маладняку буйной рагатай жывёлы на 5,5 тысячы галоў.

— Мы сабралі ўсё самае лепшае ў адным месцы. Быкі вырошчваюцца на адкрытым паветры, таксама ёсць паілкі з электрападагрэвам, падвозы кармоў. Гэта камфорт для жывёлы, які забяспечвае стабільныя прывагу ў 980 кг, — падзяліўся дырэктар ААТ «Забалоцкі» Міхаіл Вечар.

Брыгадзір Марыс БІЛДЭРС на адкрытых пляцоўках сезоннага адкорму маладняку буйной рагатай жывёлы.



### З КЛОПАТАМ АБ ЛЮДЗЯХ



Інспектар па кадрах, намеснік старшыні прафкама Вольга СІТНІКАВА.

Усяго ў ААТ «Забалоцкі» працуе 310 чалавек. Цякучка кадраў невялікая, ды і маладых спецыялістаў тут дастаткова.

— Толькі сёлета прыйшлі тры малады спецыялісты з вышэйшай адукацыяй, тры з сярэдняй спецыяльнай і шэсць з прафтэхнічнай, — адзначыла **інспектар па кадрах, намеснік старшыні прафкама Вольга СІТНІКАВА.**

Тых, хто прадаўжае кантракт адразу на тры гады пасля размеркавання, на прадпрыемстве падтрымліваюць матэрыяльна аднаразовай выплатай у памеры 70 базавых велічынь.

— У нашай калектыўнай дамове замацавана вельмі шмат прыемных бонусаў для працаўнікоў. Гэта і матэрыяльная дапамога да самых розных свят, і пуцёўкі ў санаторыі, і дадатковыя дні да водпуску. А яшчэ мы кампенсуем 70 % ад кошту арэнднага жылля для ўсіх і 100 % для маладых спецыялістаў, якія пражываюць у інтэрнаце, — расказала Вольга Сітнікава.

Характэрна і тое, што гаспадарка стала лідарам у раёне па колькасці працоўных месцаў для непаўналетніх.

— Сёлета ў нас быў студатрад 10 чалавек і яшчэ 28 непаўналетніх асобна ўзялі. Агулам 38 дзетак у нас працавалі. Яны на складзе і на фермах дапамагалі. Падабаецца і ім, і нам. Хто хацеў, усе зарабілі, — ніхто не пакрыўдзіўся, — падзялілася інспектар па кадрах.

Атмасфера ў калектыве добрая. Сюды прыходзяць працаваць цэлымі сем'ямі. У гаспадарцы ёсць комплекс па вырошчванні быкоў, які дзеліцца на 8 пляцовак. І так склалася, што кожную з іх абслугоўвае сямейная пара, што стварае адмысловую, амаль хатнюю атмасферу адказнасці і адданасці справе.

**Лізавета ГОЛАД,**
**фота аўтара.**
**Алена ДАЎЖАНОК.**

УНП 600020893


Дырэктар Людміла КАЦЯК.

# ААТ «Урэцкі»: 95 ГАДОЎ У СТРАІ

Сёлета ААТ «Урэцкі» спаўняецца 95 гадоў. За сваю шматгадовую гісторыю прадпрыемства зведала і ўзлёты, і падзенні. Але, нягледзячы ні на што, захавала свой патэнцыял і стала тэхналагічнай гаспадаркай, якая ўпэўнена глядзіць у будучыню. Як жа тут спраўляюцца з сучаснымі выклікамі?


Збожжасушыльны комплекс гаспадаркі.

Загадчыца цэнтральнага склада Ірына ЯСІНСКАЯ.

## ТОЛЬКІ НАПЕРАД

Гісторыя ААТ «Урэцкі» бярэ свой пачатак у 1930 годзе, калі быў утвораны калгас «Урэцкі». Пад такой назвай аграрнае прадпрыемства існавала да пачатку XXI стагоддзя і стала адным з перадавых у сваім рэгіёне. У 2003 годзе калгас перайменавалі ў сельскагаспадарчы вытворчы кааператыў, а ў 2008-м павялічылі плошчу гаспадаркі праз далучэнне да яе СВК «Дарасіна».

З 2010 года прадпрыемства называецца ААТ «Урэцкі». На яго тэрыторыі — 8 населеных пунктаў, а агульная плошча зямель складае 6261 га. Вялікую ўвагу тут удзяляюць жывёлагадоўлі, асабліва вытворчасці малака. На думку **дырэктара Людмілы КАЦЯК**, гэты кірунак самы выгадны ў сельскай гаспадарцы.

— 80 % даходу прадпрыемства — гэта выручка ад малака. Гаспадарка жыве за кошт жывёлагадоўлі. Гэта няпросты шлях, але варты таго, — падзялілася яна.

Людміла Кацяк стала дырэктарам прадпрыемства ў 2022 годзе. Тады эканоміка ААТ была не ў найлепшым стане: вялікія запазычанасці і маленькі прыбытак. Стаўка на малако зрабіла сваю справу, і апошнія тры гады па ўсіх эканамічных паказчыках назіраецца станоўчая дынаміка.

— У 2022 годзе, калі я толькі прыйшла, фонд заработнай платы на канец года быў 150 тысяч рублёў. На сёння гэта лічба павялічылася да 300 тысяч рублёў, — адзначыла дырэктар.

Работнікі гаспадаркі ў сваю чаргу таксама імкнуцца дасягаць новых вышынь у сваёй прафесійнай дзейнасці. Так, сёлета **асемянатар Яніна ТУПІК** дзякуючы высокім вынікам і паказчыкам заняла першае месца ў раённым спаборніцтве спецыялістаў.

Станоўчай дынамікай, якая забяспечваецца рацыянальным выкарыстаннем кармоў, павелічэннем іх пажыўнасці і паляпшэннем умоў утрымання жывёл, падзялілася **галоўны эканаміст Таццяна ШАЛІК.**

— Сёлета дзённы надой ад каровы складае больш за 19 кг малака. Гэта амаль у тры разы больш, чым адпаведны паказчык 2018 года. За 7 месяцаў рост валавога надою малака склаў 4131,4 т, або 126,7 % да мінулага года, а рост прадукцыі вырошчвання БРЖ — 211,5 т, або 110,5 % да аналагічнага перыяду 2024 года, — адзначыла галоўны эканаміст.

Галіна раслінаводства гаспадаркі ў многім накіравана на забеспячэнне кармамі жывёлагадоўлі. У гэту ўборачную кампанію, нягледзячы на складаныя ўмовы надвор'я, гаспадарка намалаціла на 1000 т больш збожжа, чым летась.

— З году ў год ворныя землі ААТ даюць высокі ўраджай кукурузы. Правядзенне сяўбы збожжавых культур насеннем высокай рэпрадукцыі ў аптымальныя агратэхнічныя тэрміны з захаваннем рэгламентаў вырошчвання ў будучым павысіць іх ураджайнасць у 1,5-2 разы. Таксама сёлета разлічваем на высокі ўраджай цукровых буракоў, — заключыла галоўны эканаміст.


Калектыў адміністрацыі гаспадаркі. Злева направа: галоўны эканаміст Таццяна ШАЛІК, бухгалтар па раслінаводстве Надзея ЛУЧЫНА, бухгалтары Наталля БАРАНОЎСКАЯ, Таццяна МАЛЮЖЫЧ і Наталля ШУЛЯКОЎСКАЯ, інспектар па кадрах Вольга РУСАКОВІЧ.

## «Я ЎДЗЯЧНАЯ ТЫМ ЛЮДЗЯМ, ЯКІЯ ПАВЕРЫЛІ Ў МЯНЕ»

Сёння ва «Урэцкім» працуе 95 чалавек, многія з іх разам з гаспадаркай перажылі розныя этапы яе развіцця.

— Я вельмі ўдзячная тым людзям, якія зразумелі, у якім кірунку я іх вяду, і паверылі ў мяне, — падзялілася дырэктар ААТ.

Дарэчы, раней Людміла Кацяк працавала намеснікам начальніка ўпраўлення па сельскай гаспадарцы Старадарожскага раёна. Яна прызналася, што цяперашняя праца больш складаная, але і больш цікавая.

— Па адукацыі я заатэхнік, заінжынер. Не магу надоўга ісці ў адпачынак — не хапае людзей, зносін. Гэта гаспадарка стала для мяне сапраўднай сям'ёй, і я дакладна разумею, што ў маіх сілах зрабіць жыццё працаўнікоў акцыянернага таварыства лепшым, — расказала Людміла Кацяк.

— У сельскай гаспадарцы працаваць складана. На планёрку еду раніцай, вяртаюся дадому позна — стомленая, але шчаслівая.

Паводле слоў Людмілы Кацяк, для таго каб стаць дастойным кіраўніком, недастаткова быць проста добрым спецыялістам у сваёй сферы.

— Лідарства павінна быць у крыві. Ты можаш быць добрым выканаўцам, але калі ў цябе не будзе арганізатарскай жылкі, то нічога не атрымаецца. Тут трэба быць і псіхолагам у пэўнай ступені. Трэба здолець тактычна дакрануцца да глыбіні душы чалавека, каб своечасова дапамагчы яму, калі ў гэтым будзе патрэба. Таму што самая дробная бязладзіца вельмі адбіваецца на працы, — падзялілася дырэктар гаспадаркі.


Загадчыца фермы МТФ «Дарасіна» Вераніка ГОРСКАЯ добраўпарадкоўвае тэрыторыю.


Падчас вячэрняй раздачы кармоў.

## АМБІЦЫЙНЫЯ ПЛАНЫ

Шмат зроблена, аднак наперадзе яшчэ безліч новых гарызонтаў. Людміла Кацяк расказала, што ўжо ў наступным годзе ў гаспадарцы плануюць павялічыць пасяўныя плошчы рапсу і буракоў.

— З цягам часу павялічым і пагалоўе буйной рагатай жывёлы — рыхтуемся да будаўніцтва новага МТК у 2029 годзе, — адзначыла яна.

Тым не менш у гаспадарцы яшчэ ёсць рэзерв павелічэння прадукцыйнасці статка. У наступным годзе харчаванне буйной рагатай жывёлы аптымізуюць і дададуць туды соевы бялок, што ў перспектыве дасць добрыя вынікі.

Варта адзначыць, што тэхніку ў ААТ «Урэцкі» абнаўляюць рэгулярна. Зусім хутка машынна-трактарны парк гаспадаркі папоўніцца новым самаходным апырсквальнікам «Туман» і іншай спецыялізаванай тэхнікай.

Усе гэтыя планамерныя крокі наглядна дэманструюць, што ААТ «Урэцкі» не спыняецца на дасягнутым, працягвае інвесціраваць у сваё развіццё, упэўнена пракладаючы курс да свайго 100-гадовага юбілею.

**Лізавета ГОЛАД,**
**фота аўтара.**
**Алена ДАЎЖАНОК.**

УНП 600020760

# ПРАФЕСІЙНЫ ПАДЫХОД

## 115 кіламетраў ачышчаных каналаў... І гэта не мяжа!






Дырэктар Уладзімір ЖАРТУН.



Загадчык майстэрняў Іван КІЙКО і інжынер-механік Андрэй ПРЫДЫБАЙЛА сочаць за своечасовым рамонтам і абслугоўваннем тэхнікі.

**Дзяржаўнае ўнітарнае прадпрыемства «Любанскае ПМС» — гэта прадпрыемства, дзе на працягу многіх гадоў вядзецца прафесійная дзейнасць і аказваецца шэраг паслуг у галіне меліярацыйнай гаспадаркі. Вядома, што меліярацыйныя землі — адзін з самых значных фактараў стварэння належных умоў для ўрадлівасці глебы, а ў выніку і забеспячэння высокай рэнтабельнасці вытворчасці сельскай гаспадаркі. Кіруе прадпрыемствам ужо на працягу 18 гадоў дырэктар Уладзімір Жартун. З ім і пойдзе наша далейшая размова.**

**— Уладзімір Анатольевіч, раскажыце, калі ласка, як арганізавана работа вашага прадпрыемства?**

— Мы займаемся земляными работамі, праводзім рэкультывацыю глебы, меліярацыю, асвойваем землі для будаўніцтва і іншых мэт. Нашы спецыялісты могуць выканаць дрэнаж зямельных участкаў, займаюцца эксплуатацыяй і будаўніцтвам меліярацыйных сістэм. У пералік паслуг нашага прадпрыемства ўваходзяць таксама рэканструкцыя, капітальны і бягучы рамонты гідратэхнічных збудаванняў.

На нашым абслугоўванні знаходзіцца 3026 кіламетраў каналаў, 86 кіламетраў дамбаў, 260 км дарог, 2020 збудаванняў, 35 мастоў і пяць помпавых станцый.

**— Якімі паказчыкамі ваша прадпрыемства можа па праве ганарыцца?**

— За сем месяцаў бягучага года аб'ём выкананых работ склаў 10 мільёнаў 63 тысячы рублёў. Тэмп росту склаў 180 працэнтаў. Сярэдні заробак на прадпрыемстве дасягае 2472,06, рост заработнай платы склаў 140 працэнтаў. За названы перыяд праведзена ачыстка каналаў ад забруджвання на тэрыторыі ў 115 кіламетраў. Драўнінна-хмызняковая раслліннасць была выдалена на адлегласці 54 кіламетраў, адноўлены 53 збудаванні. На тэрыторыі ў 1315 кіламетраў праведзена абкошванне каналаў. Апрацоўка гербіцыдамі праведзена на тэрыторыі ў 46 кіламетраў.

Таксама вядзём догляд земляў ААТ «Беларуськалій», займаемся рэканструкцыяй меліярацыйных сістэм у шэрагу населеных пунктаў.

**— Уладзімір Анатольевіч, мяркую, у параўнанні з мінулым годам аб'ёмы работ, якія праводзяцца вашым прадпрыемствам, значна ўзраслі...**

— Так. Каб усе патрэбныя работы праводзіліся своечасова, маем усё неабходнае. Пастаянна абнаўляем парк тэхнікі. Нядаўна, напрыклад, набылі новы экскаватар. На сёння ў нас задзейнічана 14 экскаватараў, чатыры бульдозеры, два экскаватары-дрэнаўкладчыкі і два пагрузчыкі-самазвалы. На прадпрыемстве працуе 76 чалавек. Адзначу, што калектыў складаецца як з вопытных работнікаў, якія працуюць не адзін дзясятак гадоў, так і маладых спецыялістаў. Зразумела, наша работа не з лёгкіх. Асабліва напружаны час — з пачатку вясны да позняй восені, а тым больш — летам. Працоўны дзень, як правіла, не нарміраваны: пачынаецца ў 8 і заканчваецца ў 18 гадзін. Таму работнікі нашага прадпрыемства — адданыя рупліўцы, якія добра ведаюць і любяць сваю справу. На іх мы і ўскладаем надзеі.



Эканомікай прадпрыемства займаюцца дружныя калектывы бухгалтэрыі і планава-вытворчага бюро. Злева направа: начальнік ПВБ-інжынер па каштарыснай працы Ірына СЯДУН, інжынер ПВБ Яніна ЛОМСКАЯ, галоўны бухгалтар Юлія ДЗЯРКАЧ, вядучы бухгалтар Таццяна ГОЛУБ і бухгалтар па заработнай плаце Крысціна СІКІРЖЫЦКАЯ.

Тэмп неабходных работ своечасова выконваецца толькі тады, калі за справу адказваюць прафесіяналы. Такія якраз працуюць на прадпрыемстве — выдатныя спецыялісты, майстры сваёй справы, якія маюць багаты вопыт і шчодра дзеляцца ім з моладдзю. 42 гады працуе ў нас **Іван КІЙКО, загадчык майстэрняў.** Прыкладам адказнасці і адданасці працы сталі **Андрэй ПРЫДЫБАЙЛА, інжынер-механік, Яўген ІВАШКЕВІЧ, начальнік участка, Юрый ШАПЛЫКА, машыніст бульдозера, Аляксандр ПЕТРУШЭНЯ, машыніст экскаватара,** і многія іншыя работнікі.

Сёлета, напрыклад, на прадпрыемства пасля заканчэння БНТУ прыйшоў працаваць **майстрам малады спецыяліст Ягор БАГДАШЫЦ.** І мы вельмі спадзяёмся, што ён застанецца працаваць у арганізацыі.

**— Ці плануеце павялічыць спектр паслуг?**

— Так. Мы актыўна праводзім работу па зносе непрыдатных будынкаў, якія не эксплуатуюцца. Сёлета распрацавана Дзяржаўная праграма, і на яе ажыццяўленне былі выдзелены грашовыя сродкі. Паколькі раней падобныя работы мы не выконвалі, набылі для гэтага спецыяльнае абсталяванне: гідранажніцы, адбойны малаток, драбнілку. Па дагаворах з сельскагаспадарчымі арганізацыямі ажыццяўляем патрэбныя работы.

Наогул, вялікую ўвагу ўдзяляем абнаўленню тэхнікі. Як правіла, супрацоўнічаем з лізінгавымі кампаніямі. Нам ніколі не адмаўляюць у дапамозе, таму што наша прадпрыемства плацежаздольнае.

**Святлана СІЛЬВАНОВІЧ, Алена ДАЎЖАНОК. Фота Лізаветы ГОЛАД.**

УНП 600017020



Вадзіцель пагрузчыка Юрый ШАПЛЫКА займаецца разраўноўваннем грунту.

— З вялікім аб'ёмам работ, усімі пастаўленымі задачамі спраўляемся паспяхова, таму што Любанскім прадпрыемствам меліярацыйных сетак кіруе сапраўдны прафесіянал, чалавек, які добра ведае сваю справу, — далучаецца да размовы **галоўны інжынер Аляксандр КУЛАГА.** — Дзякуючы багатаму вопыту кіраўніка наша прадпрыемства працуе стабільна, забяспечана ўсім неабходным і мае высокі прыбытак. Мяркуйце самі. За першае паўгоддзе бягучага года выручка ад рэалізацыі работ, паслуг на прадпрыемстве згодна з бізнес-планам склала 5570 рублёў, а па факце — 8210. Такім чынам, аб'ём работ выкананы на 147,4 працэнта. Аб'ём падрадных работ па 12 ІС згодна з бізнес-планам склаў 3300, а па факце — 5277, што адпавядае 159,9 працэнтам. Сабекошт рэалізаванай прадукцыі пры бізнес-плане склаў 3790, па факце — 5711, а выкананне ў працэнтах дасягнула 150,7. Рэнтабельнасць продажаў пры плане ў 6,4 склала 13,8, што адпавядае 215,6 працэнта.

У нашым калектыве выпадковых людзей няма. Кожны імкнецца выканаць работу на высокім узроўні і такім чынам уносіць свой значны ўклад у паспяховае развіццё прадпрыемства. Нашы шчырасць, адказнасць і любоў да сваей справы — унёсак у агульны дабрабыт.



Галоўны інжынер Аляксандр КУЛАГА.





Машыніст экскаватара Аляксандр ПЕТРУШЭНЯ асушвае забалочаныя землі.





Начальнік участка Яўген ІВАШКЕВІЧ расказвае пра план рэканструкцыі меліярацыйных сістэм у ААТ «Рачэнь».

КАМУНАЛЬНЫЯ СТАСУНКІ

# ПРАВА НА ПЕРАРАЗЛІК

## Калі змяншаюцца плацяжы за кватэру?

Днямі была прынята пастанова Савета Міністраў № 465 «Аб разліках у сферы жыллёва-камунальнай гаспадаркі». Тады ж было зацверджана Палажэнне аб парадку пераразліку платы за некаторыя віды камунальных паслуг і прыпынення (аднаўлення) аказання камунальных паслуг. Што гэта прынясе жыхарам?



Згодна з прынятым дакументам, калі чалавек выехаў з пастаяннага месца жыхарства (рэгістрацыі па месцы жыхарства) на тэрмін звыш 10 сутак запар, ажыццяўляецца пераразлік платы за некаторыя віды камунальных паслуг. Лагічна, што калі чалавек не жыве ў кватэры, яму не трэба плаціць за абыходжанне з цвёрдымі камунальнымі адходамі, таму што ён не смеціць. Не трэба будзе плаціць за халоднае і гарачае водазабеспячэнне, водаадвядзенне (каналізацыю), а таксама газазабеспячэнне пры адсутнасці ў спажыўцоў прыбораў індывідуальнага ўліку расходу вады і газу. Чалавеку, які выехаў са свайго жылля, не трэба будзе кампенсаваць выдаткі на электраэнергію, якая спажываецца для ліфта, але не больш чым за тры гады.

Для пераразліку платы адной заявы мала, патрэбныя досыць важкія падставы. Дакументам прапісана, што гэта можа быць выезд за мяжу; на аздараўленне і санаторна-курортнае лячэнне; лячэнне ў бальніцы, шпіталі або ва ўстанове аховы здароўя, падпарадкаванай дзяржаўнаму органу. Сюды ўваходзіць і часовае ўтрыманне ў месцах папярэдняга зняволення і пазбаўлення волі.

Пераразлік прадугледжаны і тым людзям, якія праходзяць ваенную службу або службу ў рэзерве, праходжанне альтэрнатыўнай службы. Падставай плаціць мінімальную камунальную плату будзе выезд у сельскія населеныя пункты (на летні сезон), садоўніцкія таварыствы, дачныя кааператывы, на вучобу і ў працяглую службовую камандзіроўку. Пераразлік прадугледжаны пры пражыванні па дагаворах найму іншага жылога памяшкання.

Дастаткова важкай падставай будзе выезд чалавека ў сельскія населеныя пункты для працы ў сельскай гаспадарцы і сацыяльнай сферы вёскі, а таксама па працоўным дагаворы (кантракце) у арганізацыі, якія размешчаны ў раёнах, што падвергліся радыеактыўнаму забруджванню ў выніку аварыі на Чарнобыльскай АЭС. Іншую «камуналку» атрымаюць і тыя грамадзяне, якія пераехалі для работы ў якасці бацькоў-выхавальнікаў у дзіцячых дамах сямейнага тыпу; альбо выехалі ў іншыя населеныя пункты для догляду за інвалідам I групы альбо асобай, якая дасягнула 80-гадовага ўзросту і мае патрэбу ў пастаянным доглядзе.

Дарэчы, пераразлік платы ажыццяўляецца на падставе заявы грамадзяніна або плацельшчыка і іншых дакументаў. Заяву і дакументы прадстаўляюцца не пазней за 30 каляндарных дзён з дня вяртання грамадзяніна да месца жыхарства.

Пераразлік не ажыццяўляецца для грамадзян, якія выехалі за межы краіны з 1 сакавіка 2022 года на тэрмін звыш 30 дзён запар, калі яны былі ўключаны ў спіс працаздольных грамадзян, не занятых у эканоміцы, якія аплачваюць паслугі па тарыфах поўнага пакрыцця эканамічна абгрунтаваных выдаткаў.

**Сяргей КУРКАЧ.**

НАПЯРЭДАДНІ

# У СТАЛІЦЫ ПРОЙДЗЕ ФЕСТЫВАЛЬ НАВУКІ

Традыцыйнай пляцоўкай для «Фестывалю навукі — 2025» стане Цэнтральны батанічны сад НАН Беларусі. Форум пройдзе ўжо сёмы раз, а яго насычаная праграма разгорнецца 6 верасня з 11 да 19 гадзін.



Фота носіць ілюстрацыйны характар.

Сёлета мінчанам і гасцям сталіцы прадставяць больш за 10 асноўных інтэрактыўных пляцовак, адзначыў **загадчык аддзела Цэнтра сістэмнага аналізу і стратэгічных даследаванняў НАН Беларусі Аляксандр ЗАЙЦАЎ.** Так, у тэматычнай зоне «Інтэлектуальныя тэхналогіі» жадаючыя змогуць адчуць сябе інжынерамі-вынаходнікамі. Наведвальнікам прэзентуюць беларускія распрацоўкі ў галіне мікраэлектронікі, энергетыкі і матэрыялазнаўства. Тут можна будзе пагрузіцца ў свет робататэхнікі і штучнага інтэлекту, дзе ажываюць механічныя памочнікі, аўтаномныя дроны і канструктыўныя мадэлі.

На пляцоўцы «Космас» Марына Васілеўская і Алег Навіцкі адкажуць на пытанні наведвальнікаў. Тут выступіць і Вольга Масціцкая з расказам пра эксперымент «Сірыус-23», у якім яна ўдзельнічала. Дзяўчына больш за год знаходзілася ў ізаляцыі, імітуючы місію на Месяцы. Таксама там можна даведацца пра метэарыт, які знайшлі пад Смалявічамі, і нават убачыць частку гэтага загадкавага экспаната. У гэтай зоне ёсць магчымасць разгледзець спадарожнікі, даведацца, як іх робяць.

Завітаюць і госці з Расіі. Яны прадставяць сумесныя распрацоўкі, пляцоўкі і многае іншае. Госці запросяць наведвальнікаў на лакацыі «Навука нуль плюс», тэма якой — «Твая квантавая рэальнасць». Тут чакаецца больш за 20 удзельнікаў, у асноўным з універсітэтаў.

Лакацыя «100 інавацый маладых навукоўцаў» — традыцыйна адна з самых топавых. Сёлета на выставу-конкурс прадстаўлена каля 170 інавацый. Строгім журы будзе адабрана толькі 30 найлепшых работ. Гэта праекты ў сферы экалогіі, гуманітарных, тэхнічных навук. Тут маладыя навукоўцы прадставяць свае распрацоўкі, якія знаходзяцца ў высокай ступені гатоўнасці, каб іх можна было ўкараняць у адпаведных галінах. Пляцоўка будзе актуальная і для інвестараў, лічаць арганізатары.

На пляцоўцы «Смак навукі», па словах **навуковага супрацоўніка Інстытута мікрабіялогіі НАН Беларусі Ганны БАРЭЙКІ,** плануецца правесці размову пра ежу з навуковага пункту гледжання. Тут наведвальнікам прапануюць даведацца шмат цікавых фактаў пра гастраномію і нават зладзіць міні-квэсты для смакавых рэцэптараў: прадэгуставаць «касмічнае» марожанае, безлактозную згушчонку і спартыўнае харчаванне.

Прайсці па балотах, зазірнуць у глыбіні рэк і пабачыць розныя куткі планеты можна будзе ў тэматычнай зоне «Экалогія». Яшчэ жыхароў і гасцей сталіцы чакае лакацыя з умоўнай назвай «Палярная зона», дзе будзе магчымасць ад супрацоўнікаў шэрагу беларускіх і расійскіх арганізацый даведацца пра даследаванні Арктыкі і Антарктыкі. На пляцоўцы «Медыцына» таксама будзе шмат цікавага, напрыклад кібернетычныя пратэзы, што дазваляюць людзям, якія ў іх маюць патрэбу, жыць паўнавартасным жыццём.

**Сяргей КУРКАЧ.**


**ДОПОЛНЕНИЕ**
**к проектной декларации**
**ООО «СМУ-87»,**
*опубликованной в газете «Звязда» 11.02.2025 г.*
**по объекту** «Возведение жилой застройки по ул. Мястровской в м-не Лебяжий г. Минск»

Для привлечения дольщиков к строительству по договорам создания объектов долевого строительства для граждан, не состоящих на учете нуждающихся в улучшении жилищных условий, в жилом доме № 1 по г/п с пристроенным двухэтажным гаражом-стоянкой предлагаются:

**20 (двадцать)** однокомнатных квартир **площадью от 29 до 39 кв. м включительно**, стоимость 1 кв. метра **от 6 039 до 6 691 белорусских рублей;**

**5 (пять)** однокомнатных квартир **площадью от 40 до 50 кв. м,** стоимость 1 кв. метра **от 5 887 до 6 540 белорусских рублей;**

**15 (пятнадцать)** двухкомнатных квартир **площадью от 51 до 62 кв. м**, стоимость 1 кв. метра **от 5 673 до 6 300 белорусских рублей.**

На предприятии действует система регулирования стоимости, зависимая от площади, этажа и условий оплаты строящегося объекта.

Оплата производится в белорусских рублях. Указанные цены действуют до момента опубликования новой проектной декларации, дополнения или изменения к ней и при условии наличия квартир, предложенных для заключения по договорам создания объектов долевого строительства.

**Условия оплаты квартиры** – полная либо поэтапная оплата цены договора в соответствии с действующей в организации системой рассрочки платежей от даты следующей за днем регистрации договора долевого строительства в Комитете строительства и инвестиций Мингорисполкома.

Ознакомиться с планировками квартир можно по предварительной записи в офисе продаж «Гранд Кристал» по адресу: г. Минск, пр-т Дзержинского, д. 19, пом. 1567 по графику пн.–пт. с 9.00 до 19.00, сб с 10.00 до 16.00, вс. – выходной, тел. 375 (44) 711-33-00.

Прием заявлений на заключение договоров создания объектов долевого строительства будет осуществляться с 9.00 05.09.2025 г. в порядке живой очереди в офисе продаж «Гранд Кристал» по адресу: г. Минск, пр-т Дзержинского, д. 19, пом. 1567.

УНП 193672656



**РУП «ИНСТИТУТ НЕДВИЖИМОСТИ И ОЦЕНКИ»**
(Организатор аукциона)
извещает о проведении повторного открытого аукциона по продаже имущества **ОАО «Криница»** (Продавец).

**Аукцион состоится 07.10.2025 в 11.00**
**по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, д. 11,**
**3-й этаж, каб. 4.**

**Лот № 1, состав:**

1. Контрольный пост и проходная, инв. № 621/С-1161, 66,5 кв. м.
2. Здание подсобного блока, инв. № 621/С-1163, 1138,5 кв. м.
3. Помещение мойки пивовозов, инв. № 621/С-1164, 113,6 кв. м.
4. Насосная станция над артскважиной, инв. № 621/С-1166, 50,1 кв. м.
5. Здание насосно-фильтровальной станции, инв. № 621/С-1168, 254,6 кв. м.
6. Сушильный цех, инв. № 621/С-1170, 264,2 кв. м.
7. Административное здание, инв. № 621/С-1171, 322,3 кв. м.
8. Здание главного корпуса, инв. № 621/С-1172, 4055,3 кв. м.
9. Сооружение-площадка для стеклобоя, инв. № 621/С-3617, 111,6 кв. м.
10. Здание котельной, инв. № 621/С-17178, 517 кв. м.
11. Внеплощадочные и площадочные сети водопровода, инв. № 621/С-20589, 2994 м.
12. Кабельная ЛЭП, инв. № 621/С-20588, 1196,7 м.
13. Внеплощадочные и площадочные сети канализации, инв. № 621/С-20587, 2462,2 м.
14. Низковольтные сети промплощадки, инв. № 621/С-20586, 3028 м.
15. Площадочные тепловые сети, инв. № 621/С-20584, 393 м.
16. Сети газопровода, инв. № 621/С-20581, 248 м.
17. Артскважина с насосом ЭВЦ 10х63-110, инв. № 621/С-1028912.
18. Благоустройство (проезды, площадки, ограждения), инв. № 621/С-1029402, площадь – 11366,0 кв. м.
19. Резервуар промывочной воды, инв. № 621/С-1029401, площадь – 27,0 кв. м.
20. Резервуар фильтрованной воды V 500 куб., инв. № 621/С-1029400, площадь – 148,3 кв. м.
21. Резервуар фильтрованной воды V 500 куб., инв. № 621/С-1029399, площадь – 151,5 кв. м.
22. Движимое имущество (перечень на электронной торговой площадке «GOSTORG» (gostorg.by)).
23. Объекты растительного мира (перечень на электронной торговой площадке «GOSTORG» (gostorg.by)).

**Адрес Лота № 1:**
Минская обл., Несвижский р-н, г. Несвиж, ул. Кутузова, 7; 7/5; 7/2; 7/1; 7/4; 7/9; 7/8; 7/7; 7/6;
**Артскважина:**
Минская обл., Несвижский р-н, Несвижский с/с, 11.

**Начальная цена** с НДС 20 % – 3 777 759,14 руб.
Задаток – 200 000,00 руб.
Земельные участки:
1. 624250100001000118, 5,2100 га;
2. 624250100001000119, 0,3600 га.
Право постоянного пользования.
**Шаг аукциона** – 5 %.

Порядок оформления участия в аукционе, порядок его проведения, определения лица, выигравшего аукцион, а также условия аукциона содержатся в информации о проведении аукциона, опубликованной на электронной торговой площадке «GOSTORG» (gostorg.by).

Задаток перечисляется на р/с BY85BAPB30127802900100000000 в ОАО «Белагропромбанк», BIC BAPBBY2X. Получатель – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182. Окончание приема заявлений и задатков **03.10.2025 в 11.00**.

**Организатор аукциона:**
**220030, г. Минск, ул. Комсомольская, 11, пом. 9,**
**☎ 8 (017) 324-70-57, 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52**
**• gostorg.by • e-mail: torgi@ino.by**

УНП 190055182

## ДОПОЛНЕНИЕ
### К ПРОЕКТНОЙ ДЕКЛАРАЦИИ ООО «РЕТОРСИЯ ТРЕЙД»,

*опубликованной в газете «Звязда» от 17.05.2025 г.,*

**по объекту**

«Строительство жилого района с объектами инженерно-транспортной инфраструктуры в районе д.Тарасово Ждановичского с/с Минского района Минской области».

**Жилой дом № 1 по ГП.**

Для привлечения дольщиков к строительству по договорам создания объектов долевого строительства для граждан, не состоящих на учете нуждающихся в улучшении жилищных условий, в жилом доме № 1 по генплану предлагаются:

**1 (одна)** однокомнатная квартира **площадью 34-35 кв. м,** стоимость 1 кв. метра **от 5 151 до 5 351 белорусских рублей;**

**4 (четыре)** однокомнатных квартиры **площадью 40-44 кв. м,** стоимость 1 кв. метра **от 5 151 до 5 351 белорусских рублей;**

**5 (пять)** двухкомнатных квартир **площадью 62-64 кв. м,** стоимость 1 кв. метра **от 4 606 до 4 806 белорусских рублей;**

**2 (две)** двухкомнатных квартир **площадью 81-82 кв. м,** стоимость 1 кв. метра **от 4 303 до 4 503 белорусских рублей.**

В организации действует система регулирования стоимости, зависимая от площади, этажа и условий оплаты строящегося объекта.

Оплата производится в белорусских рублях. Указанные цены действуют до момента опубликования новой проектной декларации, дополнения или изменения к ней и при условии наличия квартир, предложенных для заключения по договорам создания объектов долевого строительства.

**Условия оплаты квартиры** – полная оплата цены договора в течение 3-7 рабочих дней либо поэтапная оплата цены договора в соответствии с действующей в организации системой рассрочки платежей с даты регистрации договора в местном исполнительном распорядительном органе.

Ознакомиться с планировками квартир можно по предварительной записи в офисе продаж «Гранд Вилладж» по адресу: г. Минск, пр-т Дзержинского, д. 19, пом. 1567 по графику пн.–пт. с 9.00 до 19.00, сб., вс. – выходной либо на сайте grand-village.by.

Тел. офиса продаж +375 (29) 177-00-22.

Прием заявлений на участие в долевом строительстве будет осуществляться в порядке живой очереди с 9.00 05.09.2025 г.

УНП 691310944



## Могилевский филиал РУП «ИНСТИТУТ НЕДВИЖИМОСТИ И ОЦЕНКИ»

(Организатор аукциона)

информирует о проведении электронных торгов по продаже имущества, принадлежащего **РУП «Могилевское отделение Белорусской железной дороги»** (Продавец) на праве хозяйственного ведения

**Электронные торги состоятся 06.10.2025 в 11.00 на электронной торговой площадке GOSTORG.BY**

**Лот № 1. Станок деревообрабатывающий С26-2Н**, инв. № 44082, 2009 г. в. Начальная цена продажи: 6 360,00 бел. руб. с учетом НДС. Сумма задатка: 636,00 бел. руб. **Лот № 2. Станок деревообрабатывающий**, инв. № 44089, 1996 г. в. Начальная цена продажи: 3 360,00 бел. руб. с учетом НДС. Сумма задатка: 336,00 бел. руб. **Лот № 3. Станок вертикально-сверлильный ДЭМ-25,** инв. № 41131, 1945 г. в. Начальная цена продажи: 1 320,00 бел. руб. с учетом НДС. Сумма задатка: 132,00 бел. руб. **Лот № 4. Заточно-обеспыливающий агрегат**, инв. № 41136, 1986 г. в. Начальная цена продажи: 1 560,00 бел. руб. с учетом НДС. Сумма задатка: 156,00 бел. руб. **Лот № 5. Станок деревообрабатывающий ГС-601**, инв. № 44028, 1994 г. в. Начальная цена продажи: 1 020,00 бел. руб. с учетом НДС. Сумма задатка: 102,00 бел. руб. **Лот № 6. Станок деревообрабатывающий ВБ-1,** инв. № 42015, 1993 г. в. Начальная цена продажи: 5 760,00 бел. руб. с учетом НДС. Сумма задатка: 576,00 бел. руб. **Лот № 7. Устройство отсоса древесной стружки ОС-1700**, инв. № 44044, 2007 г. в. Начальная цена продажи: 384,00 бел. руб. с учетом НДС. Сумма задатка: 38,40 бел. руб. **Лот № 8. Станок токарно-винторезный 1К-625,** инв. № 44004, 1963 г. в. Начальная цена продажи: 5 760,00 бел. руб. с учетом НДС. Сумма задатка: 576,00 бел. руб. **Лот № 9. Станок вертикально-сверлильный 2А 125,** инв. № 44015, 1968 г. в. Начальная цена продажи: 2 040,00 бел. руб. с учетом НДС. Сумма задатка: 204,00 бел. руб. **Лот № 10. Станок точильно-шлифовальный В3-379-01**, инв. № 44025, 2008 г. в. Начальная цена продажи: 2 760,00 бел. руб. с учетом НДС. Сумма задатка: 276,00 бел. руб. **Лот № 11. Станок диленно-реечный с ролико-дисковой подачей ЦА-2А,** инв. № 44166, 1982 г. в. Начальная цена продажи: 3 120,00 бел. руб. с учетом НДС. Сумма задатка: 312,00 бел. руб. **Лот № 12. Станок круглопильный универсальный Ц 6-2**, инв. № 44253, 1985 г. в. Начальная цена продажи: 1 680,00 бел. руб. с учетом НДС. Сумма задатка: 168,00 бел. руб. **Лот № 13. Станок деревообрабатывающий (фуговальный) СФ-4**, инв. № 44676. Начальная цена продажи: 1 800,00 бел. руб. с учетом НДС. Сумма задатка: 180,00 бел. руб. **Лот № 14. Станок поперечно-продольный фрезерный ВПФ-038-02,** инв. № 44956, 2007 г. в. Начальная цена продажи: 2 760,00 бел. руб. с учетом НДС. Сумма задатка: 276,00 бел. руб. **Лот № 15. Станок абажурно-лобзиковый АЖС-5**, номен. № 5002123, 1984 г. в. Начальная цена продажи: 1 320,00 бел. руб. с учетом НДС. Сумма задатка: 132,00 бел. руб. **Лот № 16. Станок «КУСОН»-3/1500**, инв. № 44482, 1985 г. в. Начальная цена продажи: 5 898,34 бел. руб. с учетом НДС. Сумма задатка: 589,83 бел. руб. **Лот № 17. Устройство для отсоса стружки (ОС-1700)**, инв. № 41612, 2009 г. в. Начальная цена продажи: 384,00 бел. руб. с учетом НДС. Сумма задатка: 38,40 бел. руб. **Лот № 18. Станок ленточно-отрезной СЛП-2П**, инв. № 40044, 2005 г. в. Начальная цена продажи: 1 920,00 бел. руб. с учетом НДС. Сумма задатка: 192,00 бел. руб. **Лот № 19. Станок деревообрабатывающий УДС-2**, инв. № 44164, 1984 г. в. Начальная цена продажи: 2 640,00 бел. руб. с учетом НДС. Сумма задатка: 264,00 бел. руб. **Лот № 20. грузовой фургон (FURGON) ZIL-131**, гос. № AI 9862-6 (инв. № 50417). Начальная цена продажи: 15 360,00 бел. руб. с учетом НДС. Сумма задатка: 1 536,00 бел. руб.

**Местоположение: лоты №№ 1–5: г. Могилев, ул. Паровозная, 1а, лоты №№ 6–7: г. Могилев, ул. Паровозная, 19, лоты №№ 8–10: г. Могилев, ул. Первомайская, 156д; лоты №№ 11–15: г. Слуцк, ул. Вокзальная, 1, лот № 16: г. Слуцк, ул. Вокзальная, 16, лоты №№ 17–19: г. Бобруйск, ул. Привокзальная, 10, лот № 20: г. Могилев, пос. Загорский, 5а.**

Извещение о проведении электронных торгов размещено на сайтах Государственного комитета по имуществу Республики Беларусь, Могилевского облисполкома и на торговой площадке GOSTORG.BY. Организатор торгов и оператор ЭТП: **Могилевский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»** УНП 190055182, г. Могилев, ул. Первомайская, 77, к. 352, Mogilev@ino.by.

Доп. информацию можно получить по тел.: **+375222-72-41-14, +37529-624-26-25,** на сайте ЭТП **www.gostorg.by.**


# ПРОСТЫ, ДАКЛАДНЫ І НАДЗЕЙНЫ




**Пісталет сістэмы Ваяводзіна — рарытэт калекцыі зброі Беларускага дзяржаўнага музея гісторыі Вялікай Айчыннай вайны**

Экспанаты і матэрыялы, сабраныя па гарачых слядах ваенных падзей, з'яўляюцца залатой калекцыяй музея. Вялікі ўнёсак у фарміраванне фондаў зрабіў Панцеляймон Панамарэнка. У гады вайны — сакратар Цэнтральнага камітэта Камуністычнай партыі Беларусі, начальнік Цэнтральнага штаба партызанскага руху. Дарэчы, менавіта ён у верасні 1943 года падпісаў указ аб стварэнні музея, а ў 1948 годзе перадаў на захоўванне ўнікальны пісталет канструкцыі Ваяводзіна.





Такімі рэдкімі экзэмплярамі пісталета, якія не пайшоў у серыйную вытворчасць, Галоўнае артылерыйскае ўпраўленне Чырвонай Арміі ў 1943 годзе ўзнагародзіла савецкіх военачальнікаў. У цяперашні час вядомы літаральна адзінкавыя экзэмпляры гэтай зброі. Ёсць меркаванне, што Панцеляймон Панамарэнка атрымаў пісталет канструкцыі Ваяводзіна адначасова з прысваеннем яму ў 1943 годзе звання генерал-лейтэнанта.

Чаму гэты пісталет з'яўляецца такім рарытэтам сярод мноства іншых відаў зброі? Усё пачалося ў 1938 годзе, калі Павел Васільевіч Ваяводзін узяў удзел у конкурсе па праектаванні і вырабе новага самазараднага аўтаматычнага пісталета. Конкурс быў аб'яўлены народным камісарам абароны і народным камісарам абароннай прамысловасці СССР. Мэта — узбраенне ваеннаслужачых аўтабранятанкавых войскаў. Была пастаўлена задача стварыць пісталет, з якога можна было б весці агонь па варожай пяхоце праз лючкі танка, таму пярэдняя частка пісталета павінна была мець «рэвальверную» форму.

У конкурсе ўзялі ўдзел вядучыя зброевыя канструктары Савецкага Саюза. Сваю мадэль пісталета калібру 7,62 мм прадставіў і Павел Ваяводзін, які не ўваходзіў у лік знакамітасцяў. Аднак яго ўзор па тэхнічных характарыстыках не толькі не саступаў найлепшым узорам пісталетаў таго часу, а па шэрагу пунктаў нават пераўзыходзіў іх. Пісталет адрозніваўся прастатой, дакладнасцю, надзейнасцю ўстройства. Высокая скарастрэльнасць дасягалася дзякуючы 18-патроннаму магазіну. Адзіным відавочным недахопам канструкцыі была павышаная маса пісталета.

Аднак савецкія военачальнікі не былі задаволены вынікамі конкурсу, і ён быў працягнуты. У сакавіку 1939 года пасля чарговых выпрабаванняў на палігоне найлепшымі былі прызнаны пісталеты Івана Ракава, Сяргея Каровіна, Паўла Ваяводзіна і Фёдара Токарава. Усе яны былі рэкамендаваны да дапрацоўкі.

Прыняць на ўзбраенне новы пісталет перашкодзіла Вялікая Айчынная вайна. Канструкцыя Ваяводзіна не была дапрацавана. Цяжкасці ваеннага часу не дазволілі наладзіць яго масавую вытворчасць — усе сілы былі кінуты на выпуск прадукцыі для фронту.







Усяго з 1938-га да 1942 года было выпушчана каля 1,5 тысячы пісталетаў сістэмы Ваяводзіна. Па адным экзэмпляры пісталеты знаходзяцца ў Тульскім дзяржаўным музеі зброі, Цэнтральным музеі Узброеных Сіл Расійскай Федэрацыі, Ваенна-гістарычным музеі артылерыі ў Санкт-Пецярбургу і Беларускім дзяржаўным музеі гісторыі Вялікай Айчыннай вайны ў Мінску.

**Вераніка КАНЮТА.**

**Фота Віктара ІВАНЧЫКАВА.**

# БАБУЛЯ АНЛАЙН

## НАВУЧЫЦЬ НЕ БАЯЦЦА КНОПАК

**Кіраўнік гуртка Юрый КРАСНОЎ** дапамагае пенсіянерам асвоіць камп'ютар з 2017 года, але педагогіцы прысвяціў усё сваё жыццё. За плячыма — вышэйшая адукацыя педагагічнага псіхолага і вопыт работы ў міждысцыплінарнай групе па канцэптуальных распрацоўках у сферы адукацыі. «Я заўсёды захапляўся камп'ютарнымі тэхналогіямі, любіў вывучаць розныя праграмы, іх «фішкі», — прызнаецца Юрый. — Гады праз два маёй працы ў ТЦСАН, зразумеў: трэба выкладаць пажылым людзям яшчэ і смартфоны. Тады гэта тэма была новая, ды і цяпер у Мінску складана знайсці нешта падобнае».

Спачатку групы былі зусім невялікія — на занятки прыходзіла ўсяго 2-3 чалавекі. Але з часам пра гуртoк даведаліся як зацікаўленыя ў навучанні пенсіянеры, так і іх сваякі. Дапамаглі ў папулярызацыі і сацсеткі: гэтым летам відэаролікі Юрыя Краснова сталі вірусными ў TikTok, набраўшы ў суме каля трох мільёнаў праглядаў. «Спачатку акаўнт быў створаны выключна для навучальных патрэб, — расказвае выкладчык. — На занятках з адной з груп я прапанаваў разгледзець сацыяльныя сеткі: «Аднакласнікі», «Укантакце», Facebook, Instagram. Дайшла чарга і да TikTok. Зняў 17-секундны відэаролік, як праходзіць занятак, і ён нечакана пачаў набіраць прагляды. На сёння іх ужо больш за 888 тысяч, а відэа пра нюансы навучання мае больш чым 2 мільёны праглядаў».

У каментарыях — здзіўленая і нават шакіраваная моладзь: няўжо ўмудроныя вопытам людзі не могуць самі зразумець, як карыстацца смартфонам? Выкладчык тлумачыць: хоць мабільны і заўсёды пад рукой, навучацца — і вучыць — яму значна складаней. Няма мышкі, усё даводзіцца рабіць пальцам. Нават тым пажылым, хто нядрэнна валодае камп'ютарам, спачатку цяжка асвоіцца. Варта ўлічваць: запіс на падобныя гурткі ў ТЦСАН вядзецца з красавіка, і ахвотных шмат. На курс па навучанні смартфону ўжо запісалася больш за 40 чалавек, хоць вучоба новай групы пачнецца толькі ў кастрычніку.

## ГАЛОЎНАЕ — НІКУДЫ НЕ СПЯШАЦЦА

У групах звычайна па 15—20 чалавек. За паўтары гадзіны трэба паспець удзяліць увагу кожнаму, асабліва тым, хто толькі купіў гаджэт і не ведае, з якога боку да яго падступіцца. І няхай такія пенсіянеры, па словах Юрыя Краснова, прыходзяць нячаста, асаблівы падыход усё роўна патрабуецца. Па-першае, прылады ва ўсіх розныя, па-другое — выкладанне старэйшаму пакаленню патрабуе пэўных навыкаў, галоўныя з якіх — цярпенне і метадычнасць: «Трэба запавольвацца, паўтараць шмат разоў, працаваць па канспекце, які павінен быць дакладным і зразумелым, каб не было «кашы». Толькі пакрокавыя і пранумараваныя дзеянні. І, вядома, трэба памятаць: калі ў пажылога чалавека не атрымліваецца нешта пад наглядам, адзін ён з гэтым тым больш не справіцца».

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)



Заняткі праходзяць раз на тыдзень, кожны каштуе крыху больш за рубель, таму даступны любому пенсіянеру. За курс даўжынёю ў 5-7 месяцаў атрымліваецца асвоіць як самыя базавыя рэчы — уключэнне, перазагрузка, работа з экранам, рэгуліроўка яркасці і гучнасці, — так і перайсці да тэм больш складаных. Паступова па гуртку расказваюць, як карыстацца рознымі праграмамі, ствараць кантакты, пісаць нататкі. А далей — прамы шлях да месенджараў, інтэрнэту, пошуку ў ім. Вывучаецца нават акаўнт Google і ўсе дадаткі, з ім звязаныя.

Аднак у прыярытэце заўсёды застаюцца практычныя навыкі. Выкладчык на канкрэтных прыкладах тлумачыць, які тарыф мабільнай сувязі больш выгадны пенсіянерам, як спалучаць дзве SIM-карты, падключаць тэлефон да Wi-Fi. «Больш за ўсё пенсіянераў цікавіць, дзе знайсці карты, як пабудаваць маршрут, даведацца пра расклад грамадскага транспарту. Многія хочуць навучыцца заказваць талон да ўрача, купляць лекі танней і бліжэй да дома. Патрэбна паказаць усё тое, што рэальна палегчыць жыццё», — дадае Юрый Красноў.

## УЗРОСТ НЕ ПЕРАШКОДА

У кожнага свая прычына зноў апынуцца за партай. 69-гадовая **пенсіянерка Тамара ПРУДНІК** з усмешкай расказвае, што прыйшла на заняткі дзеля сямейнай гісторыі. «Хачу аформіць радавод. Шмат інфармацыі ляжыць у архівах і інтэрнэце, а працаваць з усім гэтым амаль не ўмею. Функцый так шмат, што галава ідзе кругам, але крок за крокам, дзякуючы гуртку, усё становіцца больш зразумелым. Дзеці, унукі кажуць: чым бы бабуля ні цешылася, абы не плакала. Але ў душы яны, вядома, паважаюць маё імкненне. Кожная засвоеная функцыя або дадатак — ужо дасягненне».

**Уладзімір КРЫЛЕЎСКІ** сам некалі быў праграмістам. У свае 83 гады ён прызнаецца: «Камп'ютар разумею, а інструментарый карыстальніка смартфона не вельмі. Купіў новы і хачу зноў усё наладзіць, каб выкласці ў інтэрнэт свае навуковыя працы па фізіцы. Цікава даведацца пра меркаванне кампетэнтных людзей». **Альбіна АГАФОНАВА** прыйшла, каб не адставаць ад дачкі і ўнучкі: «Мне ўжо за 80, але хачу ўпраўляцца са смартфонам гэтак жа, як яны. А яшчэ мне важна сацыялізацыя. Калі бачыш, што і іншыя імкнуцца асвоіць новае, гэта натхняе. Пажылым людзям таксама важна самавыяўленне».

Мабыць, лепш і не скажаш. Так, падобныя курсы каштуюць сімвалічных грошай, але сапраўдная іх каштоўнасць заключана ў іншым. Гэта крок у новы этап жыцця, нагода зноў паверыць у сябе і даказаць: вучыцца ніколі не позна. А ўзрост — не перашкода ні новым пачынанням, ні даўнім амбіцыям.

**Аміна НАЗАРАВА.**

**Фота Лізаветы ГОЛАД.**


ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

**Государственное предприятие «МГЦН» 7 октября 2025 года проводит открытый аукцион № 2-АЧ-25 по продаже права заключения договора аренды недвижимого имущества, находящегося в частной собственности (далее – имущество)**

| № предмета аукциона | Местонахождение имущества | Площадь (кв. м) | Размер коэффициента спроса к базовой ставке арендной платы (от 0,3 до 3) или размер арендной платы | Начальная цена права заключения договора аренды имущества/ сумма задатка (руб.) | Целевое использование имущества | Наименование имущества, его характеристика, необходимые условия аренды и иные сведения |
|---|---|---|---|---|---|---|
| **Арендодатель – ОАО «ЗАВОДСКОЙ РАЙПИЩЕТОРГ», тел.: +37517 375-41-23, +37544 599-90-45** | | | | | | |
| 1 | г. Минск, ул. Ташкентская, 24/1-51 | 41,6 | 3 | 195,21 | Под аптеку или магазин товаров для животных | Нежилое помещение с двумя отдельными входами. Имеются: центральное отопление, электроснабжение. Здание оборудовано системой пожарной сигнализации, охранной сигнализации, видеонаблюдения. Санузел на площадях арендодателя. Удобные подъездные пути. Все ремонтные работы, технические и организационные мероприятия, а также работы, связанные с изменением назначения объекта, проводятся за счет средств арендатора без последующей компенсации затрат. **Срок аренды – 3 года** |

Организатор аукциона – государственное предприятие «МГЦН», г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 10, тел. +375 (17) 360 42 22.

Форма торгов – открытый аукцион на повышение начальной цены.

Аукцион состоится **7 октября 2025 г. в 11.00** по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 7 (зал аукционов).

Прием документов и консультации по вопросам участия в аукционе осуществляются **с 5 сентября 2025 г. по 2 октября 2025 г. включительно** в рабочие дни с 9.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 (по пятницам – до 16.00) по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6. Заявления на участие в аукционе, поступившие после установленного срока, не рассматриваются. Ответственность за достоверность сведений, указанных в документах, представленных для участия в аукционе, несут лица, их подавшие.

**Порядок оформления участия в аукционе:**

к участию в аукционе допускаются юридические или физические лица, в том числе индивидуальные предприниматели, внесшие в срок, установленный для приема документов на участие в аукционе, на указанный текущий (расчетный) банковский счет сумму задатка, подавшие организатору аукциона в указанный в извещении срок заявления на участие в торгах с приложением всех необходимых документов, заключившие с организатором аукциона соглашение о правах, обязанностях и ответственности сторон в процессе подготовки и проведения аукциона (далее – соглашение), зарегистрированные в журнале регистрации заявлений. Лицу, допущенному к участию в аукционе, организатор аукциона выдает билет участника аукциона, в котором указывается порядковый номер, под которым данное лицо зарегистрировано.

Для участия в аукционе лица, желающие участвовать в нем, подают организатору заявления на участие в аукционе с приложением следующих документов:

• документ, подтверждающий внесение суммы задатка на расчетный счет BY15 BLBB 3012 0190 3 985 8300 1001 в ЦБУ № 527 ОАО «Белинвестбанк» г. Минск, БИК BLBBBY2X, получатель – государственное предприятие «МГЦН», УНП 190398583, кодификатор назначения платежа – 40901. **Назначение платежа – задаток для участия в аукционе № 2-АЧ-25 по предмету аукциона № 1.** Сумма задатка соответствует начальной цене предмета торгов;

• копия документа, подтверждающего государственную регистрацию юридического лица или индивидуального предпринимателя, без нотариального засвидетельствования – для юридических лиц или индивидуальных предпринимателей Республики Беларусь;

• копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны учреждения (выписка должна быть произведена не ранее шести месяцев до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны учреждения – для иностранных юридических лиц.

**При подаче заявления на участие в аукционе:**

физическое лицо, в том числе индивидуальный предприниматель, желающие участвовать в аукционе, предъявляют документ, удостоверяющий личность;

представитель лица, желающего участвовать в аукционе, предъявляет: документ, удостоверяющий личность; доверенность, за исключением случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель; документ, подтверждающий полномочия руководителя юридического лица (приказ о назначении на должность руководителя, или заверенную выписку из решения общего собрания, правления либо иного органа управления юридического лица в соответствии с учредительными документами, или трудовой договор (контракт), или соответствующий гражданско-правовой договор, или иные документы, подтверждающие полномочия), – если юридическое лицо представляет его руководитель.

Документы, составленные на иностранном языке, должны представляться (предъявляться) с переводом на белорусский или русский язык (верность перевода или подлинность подписи переводчика должны быть засвидетельствованы нотариально).

**Порядок определения победителя аукциона:**

аукцион проводится в соответствии со ст.ст. 417, 418 Гражданского кодекса Республики Беларусь и порядком проведения аукциона по продаже права заключения договоров аренды недвижимого имущества, находящегося в частной собственности, утвержденным организатором аукциона (далее – Порядок).

Перед началом аукциона организатор аукциона проводит заключительную регистрацию лиц, допущенных к участию в аукционе. Заключительная регистрация представляет собой замену организатором аукциона билетов участников аукциона на аукционные номера, под которыми участники аукциона будут участвовать в аукционе. После проведения аукциона участники аукциона обязаны вернуть эти номера организатору аукциона.

Аукцион проводит аукционист, определяемый организатором аукциона. Аукцион начинается с оглашения аукционистом правил проведения аукциона, шага аукциона. Шаг аукциона устанавливается аукционистом в пределах от 5 до 15 процентов от предыдущей цены предмета аукциона, названной аукционистом.

Аукцион начинается с объявления аукционистом наименования, местонахождения, краткой характеристики недвижимого имущества, право заключения договора аренды которого выставляется на аукцион, начальной цены, срока, на который будет заключен договор аренды. После оглашения данной информации аукционист в соответствии с шагом аукциона объявляет первую цену предмета аукциона. Не допускается продажа предмета аукциона по начальной цене. Аукцион продолжается до тех пор, пока по новой объявленной аукционистом цене аукционный номер поднимет только один участник аукциона. Аукционист трижды называет цену, по которой продан предмет аукциона, и объявляет о продаже данного предмета аукциона, а также сообщает номер участника аукциона, выигравшего аукцион (далее – победитель аукциона).

Если заявление на участие в аукционе подано только одним участником, либо для участия в нем явился только один участник, предмет аукциона продается этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 процентов, а такой участник признается лицом, приравненным к победителю аукциона.

**Обязанности победителя аукциона (лица, приравненного к победителю аукциона):**

подписать протокол о результатах проведения аукциона в день его проведения;

в течение 3 рабочих дней со дня проведения аукциона в установленном порядке перечислить на текущий (расчетный) счет арендодателя сумму, за которую продан предмет аукциона, за вычетом внесенной им суммы задатка;

в течение 3 рабочих дней со дня проведения аукциона возместить организатору аукциона затраты на его организацию и проведение (информация о затратах доводится до сведения участников перед началом аукциона);

в течение 10 рабочих дней со дня проведения аукциона заключить с арендодателем договор аренды имущества.

Размер штрафа, уплачиваемого участником аукциона и (или) его победителем (приравненным к нему лицом) в случаях, предусмотренных законодательством и соглашением, составляет 99 (девяносто девять) базовых величин на дату проведения аукциона.

**Дополнительная информация:**

возможность осмотра имущества, право заключения договора аренды которого выставлено на аукцион, обеспечивает арендодатель;

организатор аукциона настоятельно рекомендует лицам, желающим участвовать в аукционе, уточнить у арендодателя возможность использования объекта под планируемые виды деятельности (в том числе с учетом требований санитарных и противопожарных норм), размеры арендной платы и коммунальных платежей, а также ознакомиться с проектом договора аренды имущества;

организатор аукциона в течение 5 рабочих дней со дня его проведения возвращает участникам аукциона, за исключением случаев, предусмотренных Порядком, внесенные ими задатки (сумма задатка, внесенного победителем аукциона (лицом, приравненным к победителю аукциона), засчитывается при оплате им стоимости предмета аукциона).

**Телефоны для справок:**

отдел аукционов – +375 (17) 360 42 22,
бухгалтерия – + 375 (17) 366 36 58.

Извещение о проведении аукциона размещено на сайтах: организатора аукциона – **www.mgcn.by** (раздел «Недвижимость в аренду»); Минского городского исполнительного комитета – **www.minsk.gov.by** (раздел «ПРОДАЖА/АРЕНДА»), Государственного комитета по имуществу Республики Беларусь – **www.gki.gov.by** (раздел «ПРОДАЖА/АРЕНДА ИМУЩЕСТВА»).

# СКАНВОРД




**ПРАВЕРЦЕ, КАЛІ ЛАСКА, АДКАЗЫ**

**Па гарызанталі:** Цягнік. Люстра. Агітка. Схіл. Іголка. Аркан. Ламбард. Аазіс. Папас. Ату. Краб. Удача. Гара. Брава. Астра. Такт. **Па вертыкалі:** Гагара. Дрэва. Кабачок. Шайба. Янот. Шмат. Стапа. Ура. Ага. Укол. Мат. Кума. Ледакол. Ананас. Тара. Рада.

**Склаў
Юрый ФАЛІНСКІ,**
*г. Мінск.*

## Надвор'е на заўтра

| | | |
|---|---|---|
| **МІНСК** 765 мм рт.сл. | +17..+19°C | +19..+20°C |
| **ВІЦЕБСК** 765 мм рт.сл. | +16..+17°C | +21..+24°C |
| **МАГІЛЁЎ** 765 мм рт.сл. | +16..+18°C | +20..+23°C |
| **ГОМЕЛЬ** 765 мм рт.сл. | +18..+19°C | +22..+24°C |
| **ГРОДНА** 762 мм рт.сл. | +18..+19°C | +23..+25°C |
| **БРЭСТ** 762 мм рт.сл. | +19..+21°C | +24..+28°C |

**Месяц**

*Першая чвэрць 31.08.–06.09. Месяц у сузор'і Казярога.*

**Геамагнітныя ўзрушэнні**




Абазначэнні:
— няма прыкметных геамагнітных узрушэнняў
— невялікія геамагнітныя ўзрушэнні
— слабая геамагнітная бура
— малая геамагнітная бура

Паводле даных Белгідрамета

### ...у суседзяў

**МАСКВА** +19..+21°C

**С.-ПЕЦЯРБУРГ** +17..+19°C



Фота Андрэя ФЕАКЦІСТАВА.

# АЛЁ, НАРОД!..

ВЯСЁЛЫЯ І ЦІКАВЫЯ ГІСТОРЫІ АД ЧЫТАЧОЎ «ЗВЯЗДЫ»

**Вядучая рубрыкі Валянціна ДОЎНАР.**

## ЗДЗІЎЛЯЦЬ, ТРЭБА ЗДЗІЎЛЯЦЬ...

**Мусіць, усе мы з'яўляемся на гэты свет, каб радаваць сваіх родных, сяброў, знаёмцаў. Я вось змалку хацеў штосьці небудзь зрабіць — ну такое, каб усе здзівіліся... І штосьці нават атрымалася.**

Адзін з першых «подзвігаў» здзейсніў на рачных вірах: пахваліўся там, што ўмею плаваць рознымі стылямі, узяўся паказваць, наколькі спрытна, і не заўважыў, як захапіўся: заплыў у самую варонку віру і пачаў знікаць пад вадой.

Добра, што сябрук быў побач, зглядзеў гэта і падаў руку.

У другім выпадку сябрука паблізу не было: дзейнічаў самахоць і з самым добрым намерам.

У сям'і завядзёнка была просьбы-загады старэйшых (а мамы і пагатоў) выконваць тут жа, ад слова.

— І што гэта нам з курамі рабіць? — забедавала аднойчы яна. — Так хораша бульбачка ўзышла, так добранька стала кусціцца, а яны дзяруць і дзяруць... Як іх сагнаць?

Мне здалося, што гэта — ну працей жа простага!

А таму назаўтра, пакуль чубаткі былі на седалах, я палавіў іх у мяшок, закінуў за плечы і, як ні цяжка было, завалок аж да самай стайні.

Вытрас там... Думаў, што груз жывы, ажно бачу, дзве куркі ну зусім не варушацца. Можа, думаю, лапкі памлелі ці крыльцы? Нічога падобнага... Хоць ты штучнае дыханне рабі...

Маме я потым пер'я ў жмені занёс, сказаў, што на нашых курэй каршуны наляцелі. Праўда, падман мой лёгка раскрыўся і перапала мне такога перцу з імберцам...



Курынага булёну — потым таксама... Праўда, ешчэ яго давялося стоячы.

...Былі свае «подзвігі» і ў дарослым жыцці. Здзівіў, помню, жончыных аднавяскоўцаў, калі разам з ёй і цешчай выйшаў жаць пшаніцу. Самыя цікаўныя тады падыходзілі бліжэй, каб увачавідкі ўбачыць, як малады зяць скручвае перавяслы, вяжа снапы, жне, ставіць мэдлікі.

І яшчэ адзін светлы ўспамін. Гадоў колькі таму ў раённую бальніцу трапіў падлетак, якому спатрэбілася тэрміновае пераліванне крыві. Яе (досыць рэдкай групы) дзе толькі не шукалі! І нідзе, на жаль, не знаходзілі.

Я ў тых мясцінах праводзіў водпуск, пра бяду пачуў выпадкова і, ведаючы, што ў мяне якраз тая рэдкая група, тут жа паехаў у бальніцу і прамым пераліваннем аддаў таму хлопцу амаль паўлітра крыві.

Праз колькі часу, зразумела ж, пацікавіўся здароўем свайго «крэўніка» і пачуў, што юнак пайшоў на папраўку, што будзе жыць. А значыць (гэта я сам дадумаў), радаваць сваіх родных і блізкіх, здзіўляць навакольных добрымі справамі.

**Аркадзь ЖУРАЎЛЁЎ,**
в. Даўжані,
Мядзельскі раён.

## 4 ВЕРАСНЯ — Даты. Падзеі. Людзі

**У краіне**

**1940** год — нарадзіўся Леанід Пятровіч Юшкевіч (г. Мінск), беларускі піяніст, педагог, прафесар (1993). З 1962 г. выкладаў у Беларускай дзяржаўнай кансерваторыі (цяпер Беларуская дзяржаўная акадэмія музыкі). Стваральнік уласнага творчага кірунку ў навучанні гульні на фартэпіяна. Аўтар работ па праблемах фартэпіяннай музыкі, метадычных дапаможнікаў для музычных навуковых устаноў.

**У свеце**

**1700** год — указам Пятра І заснаваны Прыказ рудакопных спраў. Пачатак дзяржаўнага кіравання горна-геалагічнымі работамі па пошуку руды і іншых карысных выкапняў у розных рэгіёнах Расійскай імперыі.

**1913** год — адкрыццё Паўночнай зямлі, апошняе вялікае геаграфічнае адкрыццё. Экспедыцыя на ледаколах «Таймыр» і «Вайгач» пад кіраўніцтвам Барыса Андрэевіча Вількіцкага адкрыла Зямлю Мікалая ІІ і востраў Цэсарэвіча Аляксея.

**1942** год — у газеце «Чырвонаармейская праўда» (№ 245) пачала публікавацца паэма Аляксандра Твардоўскага «Васілій Цёркін».

**1975** год — на савецкім тэлебачанні ўпершыню выйшла ў эфір тэлеперадача «Што? Дзе? Калі?» Яе першым тэлевядучым быў Аляксандр Маслякоў. Уладзімір Варашылаў, які пасля шмат гадоў вёў гульню, з першага ж выпуску перадачы працаваў у ёй пазаштатным рэжысёрам.



ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

Рэгістрацыйнае пасведчанне нумар 2 ад 17 лютага 2009 года, выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.

Дырэктар — галоўны рэдактар АНУФРЫЕВА Вольга Аляксандраўна.

АДРАС: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а.

ТЭЛЕФОНЫ Ў МІНСКУ: прыёмнай – 311 17 13 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 311 17 44, маркетынгу — 263 66 73, бухгалтэрыі — 311 17 16.

прыём рэкламы тэл./факс: 311 17 27, e-mail: reklama@zviazda.by

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

www.zviazda.by

e-mail: info@zviazda.by

(для зваротаў): zvarot@zviazda.by

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 38200000007667 ад 30.04.2004. 220013, Мінск, прасп. Незалежнасці, 79/1. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.

Тыраж 11 410. Індэкс 63850. Зак. № 1955.

Нумар падпісаны ў 19.30 3 верасня 2025 года.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12